ЛІСТАПАД 16 СУБОТА
№ 37 (493)
1940 год
ЦАНА 20 КАП.

Пролетары усіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

ТВОРЧЫЯ ПОСПЕХІ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

У скарбніцы сваёй культуры захоўвае беларускі народ выдатныя здабыткі выяўленчай творчасці — манументальныя роспісы, творы жывапісу і скульптуры, плады мастацкіх рамёслаў і архітэктуры. Усё гэта яскравейшыя ўзоры праяўлення талентаў народа. Але гэтыя таленты душыў і скоўваў прыгнёт сацыяльны і нацыянальны, жандармскі рэжым царскай Расіі. І толькі Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя адкрыла ясны і шырокі шлях да развіцця ўсіх творчых сіл і здольнасцей беларускага народа.

Дзякуючы няспынным клопатам партыі і ўрада, выключных поспехаў у сваім развіцці дасягнула выяўленчае мастацтва Совецкай Беларусі.

Дарэволюцыйная Беларусь мела трох прафесіяналаў-мастакоў, а за дваццаць совецкіх год вырас вялікі атрад творчых работнікаў беларускага выяўленчага мастацтва — здольны калектыў Саюза совецкіх мастакоў БССР. Мастацкія вучылішчы выхоўваюць папаўненне—маладыя кадры работнікаў выяўленчага мастацтва. Ізостудыі, Дамы народнай творчасці дапамагаюць творчай працы, развіццю здольнасцей самавучак. За годы Совецкай улады ўзнікла і надзвычай ярка расквітнела беларуская скульптура, высокага ўзроўню творчага развіцця дасягнулі жывапіс, графіка, афармцельскае мастацтва.

Натхнёна творыць народ! Колькі любві да вялікай соцыялістычнай радзімы, сведчання шчаслівага совецкага жыцця, у вышыўках, малюнках тканін, інкрустацыях, карцінах самавучак — шматграннай народнай творчасці, і ў жывапісу скульптуры, графіцы — творах прафесіянальных майстроў. Да гэтай радаснай творчасці далучыў свае сілы разняволены народ заходніх абласцей рэспублікі і яго майстры.

Квітнее пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі соцыялістычная культура Совецкай Беларусі.

Яркай дэманстрацыяй бліскучых здабыткаў беларускага выяўленчага мастацтва, творчай сталасці майстроў яго з'яўляецца адкрытая ў святочныя дні XXIII гадавіны Вялікага Кастрычніка, у рэспубліканскай Мінскай карціннай галерэі мастацкая выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». Пачэснае месца зойме яна ў гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва. Гэта выстаўка завяршае, падагульвае пройдзены дваццацігадовы этап творчасці беларускіх мастакоў і акрэслівае яшчэ больш велічныя і радасныя перспектывы развіцця выяўленчага мастацтва Совецкай Беларусі.

Выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» паказвае выдатны ўздым ідэйнай якасці і мастацкай спеласці творчасці беларускіх мастакоў.

Выстаўка прысвечана паказу найвялікшай ролі В. І. Леніна і І. В. Сталіна, іх баявых саратнікаў — М. В. Фрунзе, Я. М. Свердлава, С. Орджанікідзе, Л. М. Кагановіча, ролі партыі Леніна — Сталіна ў стварэнні Совецкай Беларусі. Пад вадзіцельствам большэвіцкай партыі гераічны беларускі народ заваяваў свабоду, атрымаў сваю дзяржаўнасць. Пад кіраўніцтвам партыі, пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа Совецкая Беларусь стала краінай развітай прамысловасці, соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, высокай культуры. Совецкая Беларусь—несакрушальны фарпост вялікага Совецкага Саюза на яго заходніх рубяжах з капіталістычным светам. І шчасліва жыве беларускі народ, атулены бацькоўскімі клопатамі вялікага Сталіна, сагрэты сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Вялікую жыццёвую праўду адлюстроўваюць у сваіх творах беларускія мастакі. Тэматыка выстаўкі натхніла мастакоў на стварэнне твораў вялікай ідэйнай якасці; захапляючых гледача, разгортваючых перад яго вачыма хвалюючыя карціны гісторыі беларускага народа, гісторыі арганізацыі і росквіту Совецкай Беларусі. У гэтым вялікае палітычнае, пазнавальнае, прапагандысцкае значэнне выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР».

Падрыхтоўка гэтай выстаўкі прынесла радасныя змены ў творчасць беларускіх мастакоў. Адбыўся знамянальны пераход ад эцюдаў, эскізаў, пейзажаў, якія раней займалі пераважнае месца ў творчасці нашых мастакоў, да вялікіх тэматычных карцін, да глыбокай распрацоўкі вобразаў і кампазіцыі. І ўзрасло майстэрства. Выхоўваючыся на лепшых узорах рэалістычнага мастацтва вялікага рускага народа, беларускія мастакі стварылі шмат выдатных работ.

Рыхтуючыся да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР», творча выраслі і мастакі старэйшага пакалення і моладзь. І ў гэтым надзвычай вялікае значэнне выстаўкі. Знамянальна, што старэйшы жывапісец рэспублікі В. В. Волкаў, рыхтуючыся да выстаўкі, стварыў карціну, якая пераўвышае ўсё, зробленае майстрам дагэтуль, — выдатную карціну, якая з'яўляецца не толькі адным з лепшых твораў выстаўкі, але і ўсяго беларускага мастацтва: «Выступленне Я. М Свердлава на гістарычным пасяджэнні ЦК большэвіцкай партыі, дзе мастак з вялікай мастацкай сілай стварае вобразы Леніна, Сталіна, Свердлава, Дзержынскага. Аб выдатных творчых перамогах жывапісцаў сведчаць творы «Сустрэча таварыша Сталіна з партызанамі на Заходнім фронце» і «У партызанскі атрад» Н. Пашкевіча, «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск ў 1920 годзе» Е. Зайцава, «Знянацку» М. Манасзона, «Акупанты» Г. Дакальскай, карціны Ахрэмчыка, Ліўшыца, Гаўрыленкі і іншых.

Бліскучы і поспехі скульптараў. Талепавіты, натхнёны твор «Сталін — тварэц Канстытуцыі» і сюіту партрэтаў выдатных дзеячоў большэвіцкай партыі і лепшых сыноў беларускага народа экспаніраваў З. Азгур. Цікавыя работы ў скульптуры прадставілі А. Грубэ, А. Жэраў, А. Глебаў, А. Бразэр, Н. Рапапорт і іншыя.

Радуюць творчыя поспехі мастакоў Дучыца, Кудрэвіча, Лейтмана, А. Волкава, Кроля, Касмачова, Давідовіча, Е. Ціхановіча, таварышоў з заходніх абласцей — Кшэчаноўскага, Краеўскага, Ландау і многіх іншых мастакоў старэйшага і малодшага пакаленняў.

Вялікіх творчых перамог дасягнулі мастакі Совецкай Беларусі. І гэтым яны абавязаны ў першую чаргу выключнай увазе, якую праяўляе да іх творчасці Цэнтральны Камітэт КП(б)Б і ўрад рэспублікі, — яны стварылі ўсе ўмовы для плодатворнай работы мастакоў і клапатліва дапамагаюць у іх творчасці. Аб вялікай увазе ЦК КП(б)Б да работы мастакоў сведчыць і тое, што сакратар ЦК КП(б)Б тав. М. В. Кулагін асабіста ўзначальваў выставачны камітэт, штодзённа займаўся пытаннямі палітычнага і творчага росту мастакоў.

Новыя, больш высокія патрабаванні ўправе прад'явіць зараз наша грамадскасць да мастакоў. Яшчэ больш напружанай работы патрабуе распрацоўка тэм гісторыі беларускага народа, яго гераізму і мужнасці, паказ усёй шматграннасці шчаслівай сучаснасці, стварэнне поўнакаштоўных вобразаў прадстаўнікоў вялікага беларускага народа. Не знайшла яшчэ дастатковага адлюстравання і багатая беларуская прырода, квітнеючы воблік совецкай зямлі—зямлі соцыялістычнай Беларусі. Патрэбна большае развіццё нацыянальнай формы, больш дасканалая распрацоўка характараў, узбагачэнне жанраў выяўленчага мастацтва.

Абавязак беларускіх мастакоў актыўна ўключыцца ў падрыхтоўку да Усесаюзнай выстаўкі, прысвечанай XXV гадавіне Вялікага Кастрычніка, якая адлюструе магутны росквіт Совецкага Саюза за 25 год, — да выстаўкі «Наша радзіма».

Мастакі Совецкай Беларусі натхнёны поспехам выстаўкі, прысвечанай дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, і высокай ацэнкай іх работ, атрыманай ад партыі і ўрада, — узнагароджаннем лепшых майстроў беларускага мастацтва ордэнамі Саюза ССР, натхнёны вялікім поспехам выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». І пярвейшы абавязак мастакоў БССР—плодатворна прадаўжаць сваё ідэйнае ўзбраенне, глыбока вывучаць гісторыю ВКП(б), тэорыю марксізма-ленінізма. Палітычная падрыхтаванасць, ідэйная ўзброенасць, глыбокае пранікненне ў жыццё абумоўлівае далейшае ўдасканаленне майстэрства мастакоў, іх далейшыя творчыя поспехі.

Літаратурная і мастацкая інтэлігенцыя Совецкай Беларусі горача вітае майстроў выяўленчага мастацтва з вялікімі творчымі перамогамі, з бліскучым поспехам падрыхтоўкі найкаштоўнейшай тэматычнай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР».

Да новых перамог, да новых вышынь соцыялістычнага мастацтва ўпэўнена і цвёрда крочце, таварышы мастакі Совецкай Беларусі!

На выстаўцы „Ленін і Сталін— арганізатары БССР"

Пачынаючы з 13 лістапада, штодзённа працуе выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». За першыя дні работы выстаўку наведала некалькі соцень чалавек. Сюды — паглядзець на росквіт беларускага выяўленчага мастацтва прыходзяць рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя.

У трохпавярховым будынку Карціннай галерэі БССР размешчана ўсё лепшае, што створана беларускімі мастакамі-прафесіяналамі і народнай самадзейнай творчасцю за дваццаць год Совецкай улады ў БССР.

Увесь першы паверх галерэі заняты пад экспанаты народнай творчасці. Прыгожыя тканыя дываны і кілімы, ручнікі і сарочкі, велізарнейшае і дзівоснейшае панно «Лявоніха», вытканае рукамі беларускіх ткачых, скульптурныя работы, інкрустацыі, жывапісныя карціны ўпрыгожваюць залы.

Захапляе сваёй велічнасцю выстаўка беларускага совецкага мастацтва. Карціны з мінулага Беларусі, гераічная барацьба беларускага народа поплеч з рускім народам за сваё вызваленне ад інтэрвентаў, годы станаўлення Совецкай улады, годы росквіту БССР пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі — усё гэта знаходзіць глядач на выстаўцы.

Адкрыццё ў Мінску гэтай выстаўкі — незвычайная падзея ў жыцці беларускага народа. Нездарма з кожным днём расце цікавасць працоўных да яе, узрастае наведваемасць.

У кнізе ўражанняў за адзін дзень зроблена звыш двух дзесяткаў запісаў, у якіх наведвальнікі робяць свае заўвагі, вітаюць беларускіх мастакоў з творчымі поспехамі.

***

У сувязі з адкрыццём выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» на імя Саюза совецкіх мастакоў БССР паступілі прывітальныя тэлеграмы: з Рыгі — ад Упраўлення па справах мастацтваў, з Баку — ад прэзідыума Саюза мастакоў Азербайджана, з Кіева — ад Упраўлення па справах мастацтваў, з Тбілісі — ад Саюза совецкіх мастакоў, ад студэнтаў і прафесуры Кіеўскага Дзяржаўнага мастацкага інстытута і інш. Горача вітаючы беларускіх мастакоў з адкрыццём выстаўкі, усе яны жадаюць ім далейшых поспехаў у выяўленчым мастацтве на карысць сваёй вялікай радзімы.

А. А.



Святкаванне ў Маскве XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. На здымку (злева направа): Таварышы **Г. М. Маленкоў, Л. М. Кагановіч, І. В. Сталін, М. І. Калінін, В. М. Молатаў і К. Е. Варашылаў** накіроўваюцца з Крэмля на Красную плошчу.

Фота Ф. Кіслова (ТАСС).

Ів. Гутараў

Ленінскі метад вывучэння Талстога

Да 30-годдзя з дня смерці пісьменніка

На працягу ўсяго свайго жыцця Владзімір Ільіч Ленін вельмі цікавіўся пытаннямі мастацкай літаратуры. Ленін напісаў вялікую колькасць артыкулаў на літаратурна-палітычныя тэмы, даў чоткія ўказанні для разумення буйнейшых рускіх і еўрапейскіх пісьменнікаў, геніяльна раскрыў змест віднейшых літаратурных вобразаў, даў бліскучыя ўзоры выкарыстання мастацкай літаратуры ў палітычнай, партыйнай, філасофскай барацьбе, вызначыў шлях развіцця соцыялістычнага мастацтва.

Асабліва многа ўвагі Владзімір Ільіч удзяляў Льву Нікалаевічу Талстому. Разбору творчасці Талстога Ленін прысвяціў, акрамя шматлікіх заўваг, спасылак, выказванняў,—сем спецыяльных артыкулаў, у якіх дае наглядны прыклад прымянення матэрыялістычнай дыялектыкі к канкрэтнаму літаратурнаму матэрыялу.

Разбіраючы творчасць Талстога, Владзімір Ільіч у першую чаргу выкрывае класавую сутнасць розных скажэнняў творчага вобліку пісьменніка буржуазна-дваранскай прэсы.

«...Уся гэта прэса, — гаворыць Ленін, —да тапшаты перапоўнена крывадушнасцю, крывадушнасцю двоякага роду: казённай і ліберальнай...» (т. XII, стар 331).

Прадажныя борзапісцы ліберальнага лагеру хацелі выставіць Талстога выключна з слабага боку, як прарока рэлігійна-маральнага самаўдасканалення.

Але асабліва дасталося ад Леніна ўрадаваму друку і «свяцейшаму» сіноду з яго... «чыноўнікамі ў расах, з жандармамі ў Хрысце, з цёмнымі інквізітарамі, якія падтрымлівалі яўрэйскія пагромы і іншыя подвігі чорнасоценнай царскай зграі». Ленін гаворыць: «Паглядзіце на ацэнку Талстога ва ўрадавых газетах. Яны ллюць кракадзілавы слёзы, упэўніваючы ў сваёй павазе да «вялікага пісьменніка» і ў той-жа час абараняючы «свяцейшы» сінод. А свяцейшыя айцы толькі што прарабілі асабліва гнусную мерзасць, падсылаючы папоў да паміраючага, каб ашукаць народ і сказаць, што Талстой «раскаяўся»... (т. XIV, стар. 402). Граданачальнікам, заправілам царскай манархіі і ўсёй бандзе яе прыспешнікаў у корані была чужой і варожай бязлітасна рэзкая **пастаноўка** Талстым самых вялікіх, самых войстрых пытанняў таго часу, і яны не маглі выказаць прама і ясна сваёй ацэнкі поглядаў Талстога на дзяржаву, на царкву, на прыватную і пазямельную ўласнасць, на капіталізм. Уся гэта рознашэрстная і густапсовая зграя царскай ахранкі імкнулася выкарыстаць і самую смерць Талстога ў якасці сродка барацьбы супроць рэволюцыйнага руху. Так, у перадавым артыкуле «Голоса Москвы» і ў кадэцкай «Речи» за 24 (11) лістапада 1910 года былі выкладзены выключна подлыя па сваёй матывіроўцы заклікі не наладжваць народных дэманстрацый, каб «не азмрочваць» скорбных дзён.

Выкрыўшы сугуба-тэндэнцыйны, ілжывы і яўна контррэволюцыйны падыход да творчасці Талстога, Ленін указвае, што... «правільная ацэнка Талстога... магчыма толькі з пункту гледжання соцыял-дэмакратычнага пролетарыята» (т. XIV, стар. 402). Гэта правільна таму, што пункт гледжання пролетарыята адпавядае аб'ектыўнаму ходу гісторыі і таму пазбаўлен той абмежаванасці, якая ўласціва эксплаатататарскім класам, гэта правільна яшчэ і таму, што барацьба за ідэі рабочага класа, за соцыялістычны пераварот у тагачаснай Расіі была барацьбой за такія формы грамадскага жыцця, пры якіх Талстой, як і іншыя вялікія мастакі свету, толькі і можа быць цанімы і чытаемы масамі.

І Владзімір Ільіч першы паставіў пытанне вывучэння творчасці Талстога «з пункту гледжання характару рускай рэволюцыі і рухаючых сіл яе», з мэтай высвятлення пытання: «чым выклікаюцца крычачыя супярэчнасці «талстоўшчыны», якія недахопы і слабасці нашай рэволюцыі яны выражаюць?» (т. XII, стар. 332).

Гэту палітычную завойстранасць у ацэнцы Талстога Ленін не толькі не проціпастаўляў гістарычнай канкрэтнасці, а, наадварот, заўсёды ўвязваў з ёю. Ленін вучыў ... «Супярэчнасці ў поглядах Талстога трэба ацэньваць не з пункту гледжання сучаснага рабочага руху і сучаснага соцыялізма (такая ацэнка, разумеецца, неабходна, але яна недастаткова), а з пункту гледжання таго пратэсту супроць насоўваючагася капіталізма, разарэння і абеззямельвання мас, які павінен быў быць народжан патрыярхальнай рускай вёскай» (т. XII, стар. 332-333).

Владзімір Ільіч высвятляе грамадскае быццё пісьменніка, яго паходжанне, выхаванне, асяроддзе, адзначае асноўныя соцыяльна-палітычныя і эканамічныя фактары, якія вызначылі быццё і свядомасць аўтара. Ленін гаворыць: «Па нараджэнню і выхаванню Талстой належаў да вышэйшай памешчыцкай знаці ў Расіі,—ён парваў з усімі прывычнымі поглядамі гэтага асяроддзя і, у сваіх апошніх творах, абрушыўся са страснай крытыкай на ўсе сучасныя дзяржаўныя, царкоўныя, грамадскія, эканамічныя парадкі, заснаваныя на парабашчэнні мас, на жабрацтве іх, на разарэнні сялян і дробных гаспадароў наогул, на насіллі і крывадушнасці, якія зверху данізу прапітваюць усё сучаснае жыццё» (т. XIV, стар. 405).

Талстой з велізарнай сілай бічаваў эксплаатататарскія класы, з нагляднасцю выкрываў унутраную фальш тых устаноў і ўстояў, з дапамогай якіх трымалася тагачаснае грамадства. Але... «крытыка сучасных парадкаў у Талстога,—пісаў Ленін у 1910 годзе,—адрозніваецца ад крытыкі тых-жа парадкаў у прадстаўнікоў сучаснага рабочага руху імення тым, што Талстой стаіць на пункце гледжання патрыярхальнага, наіўнага селяніна, Талстой пераносіць яго псіхалогію ў сваю крытыку, у сваё вучэнне» (т. XIV стар. 405)

Усё паднявольнае жыццё селяніна магло навучыць і навучыла яго ненавідзець пана, чыноўніка, папа, але не навучыла, як трэба змагацца з імі, якім метадам пабудаваць новае і справядлівае жыццё на зямлі. Адсюль і ў Талстога супярэчнасці, сапраўды крычачыя:

«Талстой адлюстраваў накіпеўшую нянавісць, паспеўшае імкненне да лепшага, жаданне пазбавіцца ад мінулага, — і няспеласць летуценнасці, палітычнай нявыхаванасці, рэволюцыйнай мяккацеласці» («Леў Талстой, як люстра рускай рэволюцыі», т. XII, стар. 334).

Ленін падкрэслівае асаблівасці поглядаў, вучэння, творчасці Талстога і вызначае яго месца ў гісторыі вызваленчага руху, у гісторыі мастацкай творчасці. «Эпоха падрыхтоўкі рэволюцыі ў адной з краін, прыдушаных прыгоннікамі, выступіла, дзякуючы геніяльнаму асвятленню Талстога, як крок наперад у мастацкім развіцці ўсяго чалавецтва» (Ленін, т. XIV, стар 400). Аднак, вучэнне Талстого аб маральна-рэлігійным самаўдасканаленні, як аснове пераўтварэння грамадскага жыцця, яго непраціўленства, апеляцыі к «духу» і г. д. рашуча перашкаджалі яму правільна зразумець і ацаніць ролю рабочага руху ў барацьбе за соцыялізм і былі па свайму зместу не толькі ўтапічнымі, але і рэакцыйнымі ў самым дакладным і глыбокім сэнсе. Владзімір Ільіч, пазнаўшы творчасць Талстога ў яе канкрэтнасці і ў яе развіцці, робіць з гэтага пазнання ўсе практычныя вывады для рэволюцыйнай барацьбы рабочага класа.

«Памёр Талстой, — пісаў Ленін у дні смерці пісьменніка,—і адышла ў мінулае дарэволюцыйная Расія, слабасць і бяссілле якой выразіліся ў філасофіі, абрысаваны ў творах геніяльнага мастака. Але ў яго спадчыне ёсць тое, што не адышло ў мінулае, што належыць будучаму. Гэту спадчыну бярэ і над гэтай спадчынай працуе расійскі пролетарыят» (т. XIV, стар. 403).

Вызначаючы затым палітычныя мэты і задачы рабочага класа ў сувязі з вывучэннем творчасці Талстога, Владзімір Ільіч падкрэслівае вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне спадчыны вялікага пісьменніка, гаворачы: «Вывучаючы мастацкія творы Льва Талстога, рускі рабочы клас пазнае лепш сваіх ворагаў, а разбіраючыся ў **вучэнні** Талстога, увесь рускі народ павінен будзе зразумець, у чым заключалася яго ўласная слабасць, не дазволіўшая яму давесці да канца справу свайго вызвалення. Гэта трэба зразумець, каб ісці наперад» (т. XIV, стар. 407).

Соцыяльную функцыю спадчыны Талстога Ленін вызначаў у цеснай адзінстве з гістарычнай абстаноўкай, улічваючы расстаноўку класавых сіл і формы праяўлення класавай барацьбы ў краіне. Так, у артыкуле 1911 года «Л. Н. Талстой і яго эпоха» чытаем: «Чверць века таму назад крытычныя элементы вучэння Талстога маглі на практыцы прыносіць іншы раз карысць некаторым пластам насельніцтва **наперакор** рэакцыйным і ўтапічным рысам талстоўства. На працягу апошняга, скажам, дзесяцігоддзя гэта не магло быць так, таму што гістарычнае развіццё шагнула не мала наперад з 80-х год да канца мінулага века. А ў нашы дні (Владзімір Ільіч меў на ўвазе перыяд збірання рэволюцыйных сіл рабочага класа для рашучага націску на капіталізм, — І. Г.) усякая спроба ідэалізацыі вучэння Талстога, апраўданне ці змякчэнне яго «непраціўленства», яго апеляцый к «Духу», яго заклікаў да «маральнага самаўдасканалення», яго дактрыны «сумлення» і ўсеагульнай «любві», яго прапаведзі аскетызму і квіетызму і т. п. прыносіць самую непасрэдную і самую глыбокую шкоду» (т. XV, стар. 103).

Наступнай адрозніваючай рысай ленінскага метада вывучэння творчасці пісьменніка з'яўляецца тое, што Владзімір Ільіч не адрывае мастацкую творчасць ад палітычных і філасофскіх перакананняў пісьменніка, а разглядае ўсе гэтыя віды яго дзейнасці ва ўзаемасувязі і ўзаемапранікненні, як спецыфічнае праяўленне ў спецыфічнай галіне ідэалогіі адных і тых-жа класавых тэндэнцый. Гэту акалічнасць асабліва трэба падкрэсліць, таму што многія тэарэтыкі, пачынаючы з Плеханава, штучна разрывалі Талстога на мастака і мысліцеля, прычым Талстога — мастака прымалі, а Талстога — мысліцеля адмаўлялі. Ленін вырашаў гэта пытанне зусім інакш. Усе супярэчнасці ў поглядах, вучэннях, творчасці, школе Талстога Ленін вучыць разглядаць як «адлюстраванне тых у вышэйшай ступені складаных, супярэчлівых умоў, соцыяльных уплываў, гістарычных традыцый, якія вызначылі псіхалогію розных класаў і розных пластоў рускага грамадства ў парэформеную, але дарэволюцыйную эпоху» (т. XIV, стар. 402).

Такія, каротка, асноўныя рысы ленінскай метадалогіі літаратуры прыстасоўна да вывучэння творчасці асобнага пісьменніка. Што гэта не штучная схема і не выпадковы падбор момантаў, а закнамерныя прынцыпы ленінскага аналізу, жалезная неабходнасць сапраўды навуковага разбору мастацкай творчасці, — сведчыць той факт, што і ў рабоце аб Герцэну Владзімір Ільіч узнаўляе літаральна тыя-ж прынцыповыя моманты выкладання.

Вывучаючы ленінскія артыкулы аб Талстым, мы ўзбройваем сябе навуковай метадалогіяй літаратуры, а працуючы над вялікімі тварэннямі Талстога, мы ўзбагачаемся ведамі складанай гісторыі рускай грамадскай мыслі, ведамі жыцця, псіхікі і быту тагачаснага рускага грамадства.

Леў Нікалаевіч Талстой, гэта найвялікшая глыба розуму, пазнанняў, назіранняў, але раскрыць яе нетры, адкрыць мастацкія вытокі, вывучыць гэту горную вяршыню літаратурнай творчасці магчыма толькі пры дапамозе ўсёсільнай і неперамажнай, адзіна правільнай тэорыі Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.



Святкаванне ў Мінску XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. **На здымку:** артылерыя на парадзе.

Фота М. Савіна (БелТА).

Мастацкая выстаўка „Ленін і Сталін—арганізатары БССР“

★ ★ ★

Зм. Бядуля

РОСКВІТ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА БССР

Выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» па тэматычнай цэльнасці і глыбокай ідэйнай мэтаімкнёнасці глядзіцца як адзін вялізны твор, які адлюстроўвае жыццё Беларусі. Перад гледачом разгортваецца ў пластычных і жывапісных вобразах гісторыя народа, яго пакуты ў мінулым, яго благародства і героіка, яго перамогі пад кіраўніцтвам мудрай партыі большэвікоў, яго шчасце ў эпоху Сталіна.

У тэматычнай гармоніі выстаўкі адчуваецца спаяная творчая сіла калектыва мастакоў Беларусі. Разам з гэтым выстаўка трактуе росквіт беларускага выяўленчага мастацтва за апошнія дваццаць год. За выключэннем некалькіх майстроў старэйшага пакалення, бадай, усе ўдзельнікі выстаўкі зусім маладыя.

Наша мастацтва юнае, як вясна, як народнае шчасце, як Сталінская Канстытуцыя, таму яе тэматыка такая суцэльная і хвалюючая, поўная глыбокага зместу.

Звычайна мастакі ілюстрыруюць творы паэтаў і пісьменнікаў, а на гэтай выстаўцы ёсць нямала карцін і скульптур, якія сваёй глыбокай жыццёвасцю і дасканалым мастацкім выкананнем натхняюць паэтаў і пісьменнікаў пісаць на гэтыя-ж тэмы мастацкія творы.

Карціна В. Волкава «Выступленне тав. Свердлава на гістарычным пасяджэнні ЦК партыі большэвікоў 10 (23) кастрычніка 1917 года» з'яўляецца яскравай аповесцю аб тым, як правадыры комуністычнай партыі, геніі савецкага народа прыступілі да вызвалення Беларусі з-пад ярма вечнага гнёту і эксплаатацыі. На доўгія годы застанецца жыць гэта палатно. Яно напісана з натхненнем, з любоўю, з глыбокай удумлівасцю і дасканалым майстэрствам. Жыццёвая праўда, эпічнасць і лірызм спалучаюцца тут у адно на яркім фоне гісторыі.

Кватэра петраградскага рабочага. Скромна абстаўлены пакой. Вечар. За простым сталом слухаюць даклад Свердлава аб становішчы ў Мінску. Ленін, Сталін, Свердлаў, Дзержынскі, Урыцкі і Калантай. З-пад зялёнага абажура настольнай лямпы на іх падае святло. Гэтым ззяннем азараюцца твары. Усе з вялікай напружанасцю слухаюць даклад Свердлава. Ярка выражаны характары кожнага з слухачоў. Галава Леніна выпукляецца, як скульптура. На яго твары адчуваецца рашэнне пастаўленага пытання пра Беларусь. Пра гэта самае гавораць і выразы твараў кожнага з прысутных. Дзержынскі па-асабліваму напягнуў на сябе пальто ў накідку. Відаць, не зусім цёпла ў кватэры рабочага. Правая рука Дзержынскага ляжыць на стале — жылістая, магутная, рашучая. Адна гэта дэталь гаворыць пераконваюча аб тым, што хутка пачнуцца ў Беларусі гістарычныя падзеі. Калантай усёй істотай імкнецца да слоў дакладчыка. Яна забыла пра холад у кватэры і адкінула хустку на крэсла. Спакойна прадумвае даклад Сталін. Урыцкі якбы назірае за ўражаннем, якое робіць на ўсіх дакладчык...

Чым больш глядзіш на карціну, тым больш яна цябе захапляе сваёй пераконваючай жыццёвасцю. Ты адчуваеш нават своеасаблівасць вопраткі кожнага з прысутных. Табе становіцца ясна, што людзі сядзяць ужо даўно, што даклад падыходзіць к канцу. Аб гэтым сведчаць дзве шклянкі чаю. Кожная шклянка напоўнена толькі на адну трэць. Пілі час-ад-часу, маленькімі глыткамі. Шклянкі чаю—надзвычай удалая дэталь, якая тут неабходна, бо адыгрывае пэўную тлумачальную ролю.

Кожны штрых, кожная дэталь па чоткасці, жыццёвасці, псіхалагічнай неабходнасці і мастацкай пераканаўчасці даводзіць, што ў старэйшага майстра кісці тав. Волкава нашы маладыя мастакі павінны шмат чаму вучыцца.

З такой-жа сілай, як карціна Волкава, захапляе скульптура З. Азгура «Сталін — тварэц Канстытуцыі». Тое самае натхненне майстра, захапляючае пачуццё, чоткасць формы, глыбокая мысль і дасканалае мастацкае выкананне. Ад скульптуры вее веліччу геніяльнага мысліцеля-правадыра і яскравай рамантыкай нашых дзён. Аб гэтым кажа і большасць азгураўскіх твораў.

Пільную ўвагу наведвальніка выстаўкі прыцягваюць карціны Н. Пашкевіча: «Беларускія партызаны на прыёме ў таварыша Сталіна» і «У партызанскі атрад». І ў першай і ў другой карціне шмат глыбіні, лірычнай настраёвасці, адчуваецца сіла і гераізм беларускага народа. Ад карцін Пашкевіча аддае нутраным агнём захапліваючага пачуцця, своеасаблівай кампактнасцю фарбаў і чоткасцю кампазіцыі.

Хаця мы не ўпершыню бачым «Лірніка» А. Груба, але кожны раз гэта дасканалая разьба гаворыць нешта новае да твайго сэрца. «Лірнік» асацыіруецца з цяжкім і цёмным мінулым беларускага народа, калі жабракі-лірнікі хадзілі ад вёскі да вёскі. Калі ўспамінаеш гэта змрочнае мінулае, яшчэ ярчэй выступае наша яркае сёння. Удумлівыя, арыгінальныя і смелыя іншыя работы тав. Груба.

Надзвычай цікавая кампазіцыя скульптара Н. Рапапорта «Вызваленне Заходняй Беларусі». Прыцягвае да сябе скульптар А. Орлоў сваімі дасканалымі творамі. Таварышы Рытэр, Бембель, Бразэр і іншыя скульптары далі рад вельмі яркіх твораў.

У жывапісу вызначаюцца сваімі работамі: Дакальская, Зайцаў, Забераў, Здановская, Басмачоў, Ліўшыц, А. Волкаў, Е. Ціхановіч, Давідовіч. Праца кожнага з іх патрабуе спецыяльных нарысаў.

Мне здаецца, што варта было-б на працягу ўсяго часу існавання выстаўкі ў памяшканні Карціннай галерэі змяшчаць у перыядычным друку нарысы аб лепшых нашых мастаках, пасля чаго надрукаваць гэтыя нарысы асобнай кніжкай.

Удасканальваць майстэрства

Найбольш поўнае раскрыццё ідэі, зместу і адшуканне адпаведнай формы, кампазіцыі карціны, яе жывапіснага вырашэння — задача кожнага мастака. Нам трэба многа працаваць і вучыцца ў жыцця, каб ствараць сапраўдныя творы мастацтва.

Што датычыць мяне, як мастака, то я ставіў задачай паказаць у сваіх карцінах грамадскіх дзеячоў нашага часу, перадавых людзей соцыялістычнага грамадства і перш за ўсё — вобразы Леніна і Сталіна.

Увасобіць у творах мастацтва вобразы нашых вялікіх правадыроў, геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна — вялікая мэта совецкіх мастакоў. Нам трэба ўмець не толькі фіксіраваць назіранні знешніх рысаў, а глыбока разумець і адчуваць усю незвычайную веліч жыццёвага шляху вялікага чалавека. Мастаку трэба адчуваць і разумець ва ўсёй разнастайнасці і сіле цудоўную совецкую рэчаіснасць, няспынна ўзбройваць сябе ідэйна, быць неразрыўна звязаным з жыццём народа.

Я напісаў партрэт В. І. Леніна. Першыя годы рэволюцыі... Краіна стала свабоднай і шчаслівай. Уладзімір Ільіч у Маскве, на фоне Крэмля. У баку стары мост, рака, набярэжная, без граніту, але ўсё лікуе, — святочна свабоднае новае жыццё, нават прырода стала ярчэйшай і паветра напоена святлом — колерам сонца, радасці і шчасця нашых будучых дзён... Таму я колерам браў яркае, трымаючы жывапіс у цёплай гамме з элементамі дэкарацыйнасці.

Другая мая адказная работа — кампазіцыйны партрэт таварыша Сталіна, — Сталін паказан на фоне новай Масквы. Я зрабіў шмат варыянтаў гэтай кампазіцыі.

Знешне простыя, стрыманыя вобразы людзей тояць у сабе ўнутранае гарэнне, напружанне мыслі і пачуцця. Мастак павінен ўсе гэтыя якасці чалавека перадаваць у сваіх работах. Я рысаваў з натуры народных музыкантаў — беларускіх дудароў, ткачых. Імкнуўся паказаць іх праўдзіва, жыццёва.

Мая апошняя работа — партрэт акадэміка Н. . Нікольскага. Ствараючы партрэт вучонага, я імкнуўся ўвасобіць у ім новыя якасці, рысы, якія ўласцівы чалавеку нашай эпохі. Такая тэма маёй карціны. Перад тым як пачаць работу, я шукаў кампазіцыю па натуры і спыніўся на тыповай штодзённай позе вучонага: за сталом, на фоне велізарнай бібліятэкі, у левай руцэ блакнот — тэзісы навуковай работы, з якіх пішацца праца. Я ставіў сваёй задачай стварыць вобраз чалавека з яго духоўным і знешнім зместам жывапіснымі сродкамі колеру.

Будучае партрэта захапляе мяне. Хочацца шмат і настойліва працаваць у гэтай галіне, адлюстроўваючы совецкую рэчаіснасць, а для гэтага патрэбна нястомна павышаць сваё майстэрства і ідэйна-палітычны ўзровень.

Н. ТАРАСІКАЎ.



«Знянацку...» Карціна мастака М. І. Манасзона.

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

★

Агляд творчых поспехаў

Мінула ўсяго 15 год з дня арганізацыі першай Усебеларускай мастацкай выстаўкі, а за гэты час выяўленчае мастацтва БССР заняло адно з відных месц на фронце выяўленчых мастацтваў рэспублік Совецкага Саюза.

Выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары БССР», гэта па сутнасці, першая тэматычная мастацкая выстаўка ў БССР. Яна з'яўляецца буйнейшай падзеяй у мастацкім жыцці рэспублікі, аб'еднала ўсе творчыя сілы на стварэнне твораў, адлюстроўваючых гераічнае мінулае нашай краіны, барацьбу пролетарыята і сялянства пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна за ўладу Советаў, гаспадарчае і культурнае будаўніцтва совецкай краіны. Яна таксама з'яўляецца аглядам творчых дасягненняў мастакоў і скульптараў Совецкай Беларусі.

На выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» я прымаю ўдзел двума тэматычнымі работамі: «Беларуская вёска ў дні Кастрычніка 1917 года» і «Вялікі гідраторф», а таксама некалькімі эцюдамі, паказваючымі тарфяныя пейзажы і алеі парка.

Працуючы на працягу многіх год амаль выключна ў галіне пейзажу, я, шчыра кажучы, баяўся брацца за тэматычную карціну, адчуваючы недахоп вопыту ў гэтай галіне жывапісу. Апрача таго, мяне ўтрымлівала ад гэтага яшчэ і крытыка ўнушэннем, што тэматычны твор будзе мне «не падсілу». Але аказваецца, што пры ўпартай працы і настойлівасці можна перамагчы цяжкасці і дасягнуць многага. Няхай першая работа будзе і не зусім удалай, але прынясе яна шмат вопыту і ведаў, скарыстаўшы якія ў наступнай рабоце, дасягнеш лепшых вынікаў.

Мая карціна паказвае агітатараў, франтавікоў, якія прышлі ў вёску са словам большэвіцкай праўды. Я пастараўся паказаць сялян, уважліва слухаючых агітатараў і гатовых да дзеяння — да барацьбы за зямлю. Матэрыял для карціны «Вялікі гідраторф» сабран мною ў часе паездкі на завод «Асінторф». У гэтай рабоце я імкнуўся перадаць працу людзей, узброеных тэхнікай, а таксама пейзаж тарфяных балотаў, якімі багата наша рэспубліка.

Усё-ж усведамляеш, што зроблена мала, што ў будучым трэба яшчэ больш і лепш працаваць, глыбей вывучаць жыццё, нашу багатую совецкую рэчаіснасць, а гэта ўзбагаціць як ідэйна, так і якасна вынік працы мастака.

Н. ДУЧЫЦ.



«Народнае Сабранне Заходняй Беларусі». Карціна мастака Ф. А. Модорава.

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

Працую над серыяй лінагравюр

Выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» дэманстрыруе рост творчых сіл мастакоў.

Экспаніруемыя мною на гэтай выстаўцы работы з'яўляюцца часткай вялікай серыі каляровых лінагравюр «Мінск», у якіх я хачу паказаць не толькі рост нашай сталіцы з яе новымі культурна-грамадскімі будынкамі, але і паказаць перабудову яе жыцця і быту.

Каляровая гравюра з'яўляецца адной з тых галін графічнага мастацтва, якія, як і гравюра на дрэве, на медзі, афорт і літаграфія, масавымі тыражамі пранікаюць у шырокія масы працоўных.

Выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» з'яўляецца для мяне — стымулам к завяршэнню задуманай серыі каляровых лінагравюр. У мяне падрыхтаваны ўжо эскізы гравюр «Раз'езд з Тэатра оперы і балета», «Ля вакзала», «Гулянне ў парку імя Горкага».

А. ТЫЧЫНА.



Акадэмік Н. Нікольскі, партрэт. Работа мастака Н. Л. Тарасікава.

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

Хв. Шынклер

Радасная падзея

Радасна за нашых мастакоў, радасна за беларускае совецкае выяўленчае мастацтва. Выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары БССР»—сапраўднае свята культуры беларускага народа. Яна—красамоўны паказчык таго, як велічная, хвалюючая тэма новай эры ў жыцці народа натхняе мастака, расквечвае палітру жывапісца, адухоўлівае стыло скульптара, дае неабсяжныя прасторы для творчага выяўлення талентаў.

Ашаламлівае грандыёзнасць выстаўкі. 900 твораў! І кожны з іх прыцягвае ўвагу гледача, кожны з іх варты глыбокага дэтальнага вывучэння. Гэтага нельга зрабіць за кароткія гадзіны вернісажа. Аднак, у памяці надоўга застаюцца асноўныя, прыметныя ў раздзелах выстаўкі, творы. Побач з вядомай ужо нам, да некаторай ступені этапнай у беларускім выяўленчым мастацтве, карцінай Зайцава «Уваход Чырвонай Арміі ў Мінск у 1920 годзе» пачэснае месца займаюць такія выдатныя творы, як «Беларускія партызаны на прыёме ў таварыша Сталіна» і «У партызанскі атрад»—Пашкевіча, «Выступленне тав. Свердлава на гістарычным пасяджэнні ЦК партыі большэвікоў у 1917 годзе»—В. Волкава, «Таварышы Сталін і Орджанікідзе ў Рэўваенсовеце Заходняга фронта»—Красоўскага, «Затрыманне карнілаўскіх эшалонаў у Гомелі і іх разбраенне пад кіраўніцтвам тав. Кагановіча»—Гаўрыленкі, «Салдаты Заходняга фронта ў тав. Фрунзе»—Мірынгофа. Гэтыя творы, як і рад іншых, у якіх паказаны вобразы кіраўнікоў партыі большэвікоў, мужнасць і гераізм народа, ствараюць найбольш моцнае ўражанне. Узнаўляючы гістарычныя факты слаўнага мінулага, яны маюць вялікае выхаваўчае значэнне.

Захапляючыся творчымі поспехамі, ростам майстэрства нашых мастакоў, мы не забываем таго, што творы, прадстаўленыя на выстаўцы,—толькі пачатак распрацоўкі невычэрпнай тэмы. Пра гэта сведчыць выбар аўтарамі сюжэтаў—вузлавыя пункты гістарычных падзей, а таксама характар кампазіцыйнай пабудовы—масавыя сцэны. Не выпадкова таму і такая дэталь, як частая паўторнасць рэчавых кампанентаў кампазіцыі (стол, трыбуна аратара).

Якія-ж магчымасці абяцае нашым мастакам далейшая распрацоўка тэмы, якой прысвечана выстаўка! Штаб таварыша Сталіна на Мінскім вакзале, поўным бурлівага прыфронтавага жыцця. Гутаркі тав. Калініна з сялянамі Бабруйшчыны, яго паездка з агітпоездам па Беларусі. Прапагандысцкая дзейнасць тав. Кагановіча ў часы керэншчыны, калі ён у мэтах канспірацыі працаваў шаўцом у Гомелі. Крапатлівая работа тав. Фрунзе сярод царскіх салдатаў у прыфронтавым мястэчку Івянец—і шмат, шмат іншага. Якое багацце яркіх сюжэтаў чакае яшчэ кісці мастака! Якое багацце разнастайных творчых напрамкаў, манер пісьма будзе ўдасканалена, паглыблена ў гэтай захапляючай працы. А гэта разнастайнасць яскрава вызначаецца ўжо цяпер, і яна асабліва радуе. Арыгінальная танальнасць палітры маладога мастака Тарасікава (партрэт В. І. Леніна, партрэт вучонага), своеасаблівая трактоўка каляровай гаммы і святла Пашкевічам—жыва абмяркоўваюцца на выстаўцы. Тут, ля лепшых твораў, разгортваецца страсная творчая дыскусія.

Значны крок наперад зроблен беларускімі мастакамі і ў вобразным адлюстраванні сучаснасці. Гэта, перш за ўсё, скульптурныя партрэты Азгура, гэта карціны Зевіна («Кецельшчыцы»), Ліўшыца («У калгаснай аборы»). Апошнія дзве прыцягваюць агульную ўвагу ўдалым вырашэннем святла і прасторы, сонечнай яркасцю фарбаў.

Толькі год мінуў з дня вызвалення Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў. А як многа даў гэты год для творчага росту мастакоў, што працуюць на вызваленай зямлі. Яны прышлі на выстаўку з радам значных твораў. Толькі ўсхваляванае стыло скульптара, адчуўшага радасць свабоднай творчай працы, магло стварыць такую кампазіцыю, як «Вызваленне Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй» Рапапорта, поўную высокай ідэйнасці, глыбокага філасофскага абагульнення. Цудоўна графіка Краеўскага, малюнкі Кішчаноўскага, Малярэвіч.

Шмат незабыўных уражанняў пакідае першае наведанне выстаўкі. Хочацца дасканала вывучыць, асэнсаваць лепшыя ўзоры беларускага соцыялістычнага мастацтва, прадстаўленыя на ёй.

А. Далін

ГІСТАРЫЧНАЯ ТЭМА Ў ТВОРЧАСЦІ Е. ЗАЙЦАВА

Гістарычны жывапіс — складанейшы від мастацкай творчасці. Складанейшы таму ўжо, што гістарычны жывапісец заклікан кісцю сваёй адлюстраваць на вякі спадзяванні, барацьбу, радасць і пакуты чалавецтва ў тую ці іншую гістарычную эпоху. Гістарычны жывапісец — мысліцель, а калі гэта так, то, выходзячы з законаў жывапісу, ён павінен быць і глыбокім аналітыкам і выдатным мастаком, каб гістарычная тэма, перакладзеная на мову жывапісу, пераконвала гледача.

Тут дарэчы ўспомніць найвялікшага рускага мастака В. Сурыкава, які сваімі гістарычнымі карцінамі абяссмерціў як вялікія падзеі, так і вялікі рускі народ,—прыгадаем хоць-бы яго «Баярыню Марозаву» альбо «Раніцу стралецкага пакарання». Уплыў гэтага мастака бясспрэчна сказаўся на творчасці беларускіх майстроў, асабліва на творчасці Е. Зайцава і Г. Паўлоўскага.

Гэты артыкул хочацца прысвяціць, перш за ўсё, творчасці Е. Зайцава, які расце на лепшых традыцыях сурыкаўскай гістарычнай школы. Таленавіты прыродны жывапісец, даволі глыбокі аналітык, Е. Зайцаў, па ўсіх сваіх задатках, бясспрэчна, мастак гістарычнай тэмы. Узяць хоць-бы яго першую гістарычную карціну «Апошні бой Чапаева». Прыгадаем пераканаўчы вобраз Чапаева ў момант, калі таварышы выносяць свайго камандзіра з поля боя. Якая патрасаючая барацьба адбываецца на нашых вачах у сэрцы народнага героя: ён ранен, таварышы выводзяць яго з боя, але сэрца народнага воіна, аб'яднаўшага ў сабе сэрцы соцень яго слаўных таварышоў, не хоча пакінуць барацьбы,—яно ірвецца ў бой. Карціна гэта, напісаная ў суцэльнай суровай гамме, вельмі пераканаўчая. Тут многае ад Сурыкава, але галоўнае сказана Зайцавым сваім голасам.

Вядома, што Сурыкаў у сваіх карцінах любіў сутыкаць твар у твар гістарычныя сілы, як гэта мы бачым, напрыклад, у «Пакарэнні Сібіры». Але, пры ўсім гэтым, ён у лепшых сваіх карцінах некалькі інакш трактуе гэту сутычку гістарычных сіл. Успомнім зноў «Баярыню Марозаву». Што процістаіць гэтай фанатычнай баярыні, якая ў кляцьбе ўзняла руку і як-бы заклікае народ да супраціўлення? Спагада амаль усяго натоўпу на яе баку, пачынаючы з юродзівага на каленях і канчаючы княгіняй Урусавай, што ідзе следам за санямі, на якіх вязуць закаваную ў кандалы Марозаву. Відавочна, процістаіць гэтай сіле само пачуццё мастака, які ў гэтай карціне апеў несакрушальнасць рускага духу, логікай самай гісторыі прыведзенага затым к новаму гістарычнаму дзеянню. Гэтым новым гістарычным дзеяннем былі пятроўскія рэформы, на першы погляд варожыя народу, але гістарычна заканамерныя. Такі прыём непараўнана на больш пераканаўчы па свайму псіхалагічнаму ўздзеянню на нас, чым непасрэдная сутычка двух сіл у карціне «Пакарэнне Сібіры». Гэты, самы моцны, бок сурыкаўскага гістарычнага жывапісу правільна зразумеў і якасна інакш ужыў у карціне аб Чапаеву мастак Зайцаў.

На самой справе, на гэтай карціне мы бачым толькі чапаеўцаў, ахопленых страсцю лютай бітвы з ворагам. Белагвардзейцы дзейнічаюць недзе ў глыбі карціны, яны схаваны ад нас дымам боя і ранішнім туманам. Але па тым, як змагаюцца за кожную пядзь зямлі адважныя чапаеўцы, мы адчуваем і гэту другую сілу, што дзейнічае ў глыбі карціны. Мы не ведаем выніку боя, але, гледзячы на гэту карціну, адчуваем, што такія героі, як Чапаеў, не паміраюць і з гістарычных баёў выходзяць пераможцамі. Гэты, запазычаны ў Сурыкава, метад пераканаўчы тым, што ён не паўтарае вядомых нам з гісторыі дэталей, але дапамагае мастаку раскрыць перад намі тое галоўнае, што па-новаму хвалюе нас.

У сваёй новай карціне «Уваход Чырвонай Арміі ў Мінск» Зайцаў быў пастаўлен у больш складаныя ўмовы. Традыцый тут было менш, паколькі сусветны жывапіс у большасці выпадкаў паказваў толькі трыумф пераможцаў над пераможанымі. Успомнім хоць-бы «Крыжаносцаў» Дэлакруа. Зусім новая ідэйная задача стаяла перад мастаком Зайцавым, паколькі сама Чырвоная Армія ёсць армія, зусім новая па свайму тыпу.

Зайцаў справіўся з пастаўленай задачай. Мы бачым на яго карціне горад, ахутаны дымам і пылам спякотнага ліпеньскага дня. З глыбіні карціны ўступае ў горад Чырвоная Армія. Абветраныя, запыленыя, стомленыя воіны, разбіўшыя на подступах к гораду праціўніка, адказваюць на прывітанні гледачоў, сярод якіх нямала іх бацькоў, матак, сясцёр, нявест. Вельмі пераканаўчая жанчына на пярэднім плане са жбанком у руцэ. Яна ідзе наперадзе вайсковай часці, як-бы задаючы рух усёй гэтай велізарнай масе арміі і народа. Злева дзяўчына з шалем у руках, уся як-бы пранізаная сонцам, вітае чырвоных байцоў. У цэнтры — камандзір. Урачыста седзячы на кані, адказваючы на прывітанні, ён усёй сваёй сабранасцю гаворыць аб высокай дысцыпліне Чырвонай Арміі, гатовай ісці далей на любыя ахвяры ў імя рэволюцыі і народнага шчасця. Побач відаць выпрабаваны ў баях стары партызан. Злева ад сцяганосца — ліхі казак з гармонікам у руках, — гармонік нібы заліваецца ў яго руках, апавядаючы аб бітвах і ўрачыстасці перамогі. Над усёй гэтай групай урачыста лунае яркі сцяг перамогі. Колькі суровасці, псіхалагічнай глыбіні і рэволюцыйнай рамантыкі ў гэтай карціне, дзе мастак прывёў у рух велізарную масу людзей!

Паўтараем, галоўнае ў карціне знойдзена. Бясспрэчна, карціна магла быць яшчэ больш пераканаўчай, калі-б аўтар дапісаў яе. Яна па раду прычын не дапісана, што, натуральна, і выклікала некаторыя «разрывы» у яе жывапіснай тканіне. Заўважым таксама, што тут вінавата не толькі спешка, але і недастаткова спелае яшчэ жывапіснае майстэрства мастака. Мастак сам адчувае гэта. Пасля дэкады ў Маскве, ён усё лета і восень прысвяціў работам над натурай, эцюдам, партрэтам і нават напісаў два цудоўных натюрморты, з вопыту вялікіх майстроў ведаючы, што толькі крапатлівая, настойлівая работа над удасканаленнем майстэрства прывядзе яго да жаданых вынікаў.

Мы ўжо гаварылі, што Зайцаў па ўсяму свайму духоўнаму складу мастак гістарычнай тэмы. Гэта імкненне да абагульнення гістарычных падзей, да выяўлення іх сутнасці мы пазнаем нават у яго рабоце над партрэтам. Асабліва паказальны ў гэтым сэнсе партрэт І. В. Сталіна.

Совецкі жывапіс ведае шмат партрэтаў таварыша Сталіна, але наўрад ці скажа хто з мастакоў, што вобраз вялікага чалавека нашай эпохі з дастатковай паўнатой перададзен ім у партрэце. Не скажа гэтага і Зайцаў, але нам думаецца, што дасягнутыя гэтым мастаком вынікі вельмі значныя.

Ноч. Красная плошча. Справа ў змроку — Спасская вежа, злева — сабор Васіля Блажэннага. Там, далёка за купаламі сабора, узышло над зямлёй трывожнае зарава. Магчыма, гэта сонца, магчыма, зарава вайны, што палыхае над сусветам і насцярожвае нашы сэрцы. На грані сутыкнуўшыхся сіл мы бачым Сталіна, пільнага рулявога нашай радзімы. Ён усё ў тым-жа добра знаёмым шынелю, у фуражцы, правая рука закладзена за борт шынеля. Ён як-бы выйшаў з Спасскіх варотаў і ўпэўнена шагае праз Красную плошчу. У яго вачах, па-бацькоўску цёплых, ва ўсім яго простым чалавечым адухатварэнні вы адчуваеце, што Сталін дзень і ноч клапоціцца аб нашай радзіме, аб совецкім народзе, аб лёсе усяго свету. Створаны мастаком вобраз правадыра перарастае рамкі партрэта, дзейнічае на нас як карціна.

Беларускі народ, які не ведаў дасюль свайго гістарычнага жывапісу, мае права ганарыцца сёння мастакамі, апяваючымі яго гісторыю, яго гераічнае ў мінулым і цяпер. Сярод гэтых мастакоў выдатнае месца належыць Е. Зайцаву, таленавітаму прадаўжальніку лепшых традыцый вялікага рускага гістарычнага жывапісу.

Мастацкая выстаўка „Ленін і Сталін—арганізатары БССР“

★

І. Рубінштэйн

МАЛАДЫЯ МАСТАКІ

Эпапея грамадзянскай вайны—невычэрпная тэма для творчасці пісьменніка, кампазітара, мастака. Паказаць веліч партыі, згуртаваўшай совецкі народ для разгрому ворагаў Кастрычніка, адлюстраваць герaічныя справы асобных людзей у іх барацьбе за комунізм—задача, якая пад сілу мастаку, ўмеючаму правільна і глыбока паказваць гістарычныя факты.

Тым больш радасна адзначыць дзярзанні трох мастакоў-комсамольцаў, узяўшых на сябе задачу асвятлення герaічных спраў, зробленых беларускім народам пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна — Сталіна ў цяжкія дні белапольскай акупацыі.

На выстаўцы глядач бачыць тры карціны, напісаныя комсамольцамі на тэмы грамадзянскай вайны, гэта — «Арышт большэвіцкіх агітатараў» С. Андруховіча, «Забастоўка грузчыкаў» А. Кроля і «Разгром белапольскага атрада сялянамі» Г. Бржэзоўскага.

Што родніць гэтыя творы, напісаныя рознымі ў манеры работы мастакамі? Гэта перш за ўсё—праўдзівасць, шчырасць аўтараў, вялікая даходчывасць карцін. Трэба пры гэтым агаварыцца, што гэта даходчывасць дасягнута не ў выніку таннага знешняга эфекту, а шляхам перадачы на палатне глыбокіх ідэй аб геразме народа, аб яго самаадданай барацьбе за щасліваць і незалежнасць краіны соцыялізма.

І ў поўнай рашучасці фігуры большэвіка з карціны Андруховіча, і ў велічным спакоі сядзячага ў цэнтры рабочага з карціны Кроля, і ў вобразе замахнуўшагася кулаком на скурчыўшагася белага салдата селяніна з карціны Бржэзоўскага — глядач адчуе ўзрастаючую буру гневу і лютасці мас супроць інтэрвентаў, прасякненца духам рэволюцыі, яе ўпэўненым поступам.

Твор Андруховіча «Арышт большэвіцкіх агітатараў» як-бы пераклікаецца з карцінай Бржэзоўскага, якая рысуе актыўныя дзеянні сялян супроць грабежнікаў і мараўдэраў. Іх, гэтых сялян, натхніла на расправу з ворагамі партыя большэвікоў, прадстаўнікоў якой цікава паказаў у сваёй карціне комсамолец Андруховіч. У гэтым творы ёсць адзін вельмі ярка выражаны псіхалагічны момант, гэта жывёльны страх шпіка перад затрыманымі большэвіцкімі агітатарамі. Ён нервова дакладвае жандарму аб усім, яму вядомым, і колькі сударгавага страху ва ўсіх тых, хто сустрэўся з непахіснай воляй і магутнасцю прадстаўнікоў партыі, якая ломіць стары свет. Сіла не на баку «властей предержащих»—лаканічна паказвае карціна, а на баку затрыманых людзей. «Клас супроць класа»—такі лейтматыў твора Андруховіча.

З такой-жа сілай гэты матыў гучыць у карціне А. Кроля «Забастоўка грузчыкаў». Замысел аўтара, які імкнуўся паказаць два варожых лагеры, умела раскрыт ім.

Такім чынам, калі даць агульную адзнаку работам тт. Андруховіча, Бржэзоўскага і Кроля, то ў ідэйных адносінах яны прадстаўляюць несумненную цікавасць.

Значымасць гэтых работ яшчэ больш вырасла-б пры адпаведнай увазе маладых мастакоў да фармальнага выканння задуманых тэм. Агульным для гэтых работ з'яўляецца слабы рысунак, нядбайнасць кампаноўкі і рад іншых недахопаў, якія робяць карціны сырымі, недарысаванымі. Калі, напрыклад, узяць работу Бржэзоўскага, то ў сэнсе фармальным яна мае шмат станоўчых бакоў. Чотка, з гранічнай ясласцю зарысаваны людзі на першым плане. Таксама хвалюе фігура большэвіка (у кажушку) у карціне Андруховіча. Тут мастак прыклаў шмат намаганняў для перадачы вобраза рэволюцыянера, гатовага аддаць жыццё за народ. Тым больш прыкры нядбайнасць і спешка аўтараў у рабоце над сваімі карцінамі. Гэта спешка відаць у кожнай дэталі.

Так, Кроль, напрыклад, на многа адышоў ад першапачатковага эскіза, у якім псіхалагічнае напружанне адчувалася куды больш, чым у карціне. Пэўным штампам патыхае ад фігуры афіцэра, які процістаіць групе рабочых. Побач з выдатна нарысаваным большэвіком у карціне Андруховіча стаіць чалавек у шэрым шынелю, у якога дэфарміраван твар; сядзячы справа, хлопчык выглядае старцападобным. Ногі не нарысаваны, няма прапорцый. Калі ў цэнтры карціны Бржэзоўскага сяляне паказаны актыўна, у дынаміцы, то нельга сказаць гэтага аб бакавых фігурах. Прыкра глядзець на бягучага з левага боку чалавека, ён нібы застыў у руху.

Маладым мастакам трэба шмат працаваць над сабою, вывучаючы лепшыя ўзоры рускіх і заходнееўрапейскіх класікаў выяўленчага мастацтва. Трэба больш працаваць над натурай, пазбягаць нядбайнасці і неахайнасці ў перадачы чалавечага вобліку, больш асмыслена і глыбока распрацоўваць кампазіцыю і рысунак, цярпліва і не адзін раз перарабляць свае першапачатковыя накіды, быць патрабавальнымі да сябе, а галоўнае—па-большэвіцку змагацца за высокамастацкую прадукцыю, напоўненую благароднымі ідэямі комунізма.

★ ★ ★

Р. Мурашка

ЭКЗАМЕН НА МАЙСТЭРСТВА

(Некальні думак пра жывапіс)

Мастакі Беларусі здаюць яшчэ адзін экзамен на майстэрства. У Карцінная галерэі адкрылася выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары БССР». Гэта бяспрэчна экзамен.

На выстаўцы, галоўным чынам, прадстаўлены жывапісцы, але не адсталі графікі і скульптары. Скульптары папрацавалі добра. Але пра графікаў і скульптараў трэба гаварыць асобна.

Першы аддзел павінен быў, па думцы арганізатараў выстаўкі, адлюстраваць дарэволюцыйнае мінулае Беларусі. Трэба сказаць, што цяжкое мінулае, бадай, не знайшло адлюстравання ў гэтым аддзеле. Жабрацтва, пагромы, забастоўкі — гэта толькі рысы, якія яшчэ не ў поўным сэнсе слова характарызуюць наша мінулае. Беларусь за царскім рэжымам не карысталася ні гранам дзяржаўнай самадзейнасці, і гэты момант на выстаўцы не адзначан ніводным мастаком. І ні карціны Ю. Пэна, Давідовіча і інш., ні добрая ўвогуле графіка Б. Малкіна і Мільчына не могуць згладзіць гэтага недахопу. Адзначана жабрацтва, адзначаны пагромы, адзначана журботнасць старога горада, адзначан соцыяльны ўціск,—не адзначаны нацыянальны ўціск і прыгнечанне ў мінулым беларускага народа.

У далейшым нацыянальны момант у экспаніраваным на выстаўцы мастацтве ўсё менш і менш напамінае аб сабе. І нават можна па пальцах пералічыць працы, дзе ёсць хоць які напамінак пра яго. Да такіх карцін трэба ў першую чаргу аднесці «Акупанты» здольнага мастака Дакальскай, можа быць, Зайцава — «Уваход часцей Чырвонай Арміі ў Мінск». Можна назваць яшчэ некалькіх графікаў.

Дарэчы, графікі аказаліся больш нацыянальнымі, чым жывапісцы. Досыць прыгадаць Б. Малкіна, А. Тычыну, В. Краэўскага, Завіша, Дучыца, Фогта, Лейтмана, Геніна, каб упэўніцца ў тым. І, сапраўды, яны ствараюць уражанне сваімі відамі старога горада, старымі хатамі, ад якіх патыхае ціхаю задуменнасцю, сумотай, хмурным днём на рацэ Сож, квітнеючым садам, алеямі і сцежкамі ў парку, Бярэзінай і інш. Глядач бачыць нешта блізка знаёмае яму і ў той-жа час новае. Гэтыя работы выклікаюць настрой. Паўз іх не праходзіш проста, ля іх спыняешся і хочаш пастаяць, нават пасядзець. У гэтых работах бачыш нават без подпісаў і адчуваеш Беларусь, ведаеш, што аўтары іх жывуць і працуюць на Беларусі, а не на Каўказе, скажам, не ў Сібіры, не на Далёкім Усходзе.

Але вяртаемся да жывапісцаў. Яны прадстаўлены моцна. Вялікі майстар-прафесіянал В. Волкаў па-праву займае сярод іх цэнтральнае месца сваім партрэтам Леніна і «Выступленнем Свердлава на гістарычным пасяджэнні ЦК партыі большэвікоў у 1917 годзе». Дакальская, Ахрамчык, Манасзон, Пашкевіч, Гусеў, Гаўрыленка, Ран, Зайдэнбойтэль, Гольдрэй, А. Волкаў, А. ЗдаНоўская, Лі, Далжанскі, маскоўскі мастак Мадораў—вось, бадай, далёка яшчэ не поўны спіс атрада жывапісцаў, якія выступілі ў паход за аўладанне тэмамі гісторыі Беларусі. Нельга сказаць, каб кожнага з іх праводзіла ўдача: шмат хто прытуліўся пад крыло класічных талентаў, не знайшоўшы ў сабе досыць сілы, каб дайсці да канца, шмат хто не палічыўся з талентамі і нашта паспадзяваўся на свае сілы, шмат хто бачыў на сваім шляху дарожныя слупы, але не заўважаў людзей, якія ставілі іх.

Гістарычнаму жывапісу, у адрозненне ад гісторыка, трэба мысліць вобразамі. Майстэрства красачнай плямы не заўсёды досыць для таго, каб стварыць у гледача настрой, трэба, каб з гэтае плямы выраслі храсткі жыцця,—інакш кажучы, нават натур-морт павінен быць жывым, нават кветка, нават лісцік павінны дыхаць і пахнуць. На шмат-жа якіх карцінах глядач бачыць шмат красак, шмат зеляніны, але адчувае не тое, што хацеў мастак паказаць, а тое, чым ён паказваў. Карацей, далёка не ўсе мастакі, прадстаўленыя на выстаўцы, уладаюць сакрэтам фарбаў, не ўсе маюць войстрае вока наглядальніка, не ва ўсіх развіта творчая фантазія. Жыццё само па сабе не мае патрэбы ў тым, каб апранаць яго ў фантастычныя вопраткі. Мастак абавязан пагладзець на яго з таго боку, з якога не штодня і не кожны чалавек яго бачыць, ён павінен нават расапрануць яго, каб сказаць гледачу: «Глядзі!.. Вось яно якое, жыццё»! Трэба прымушаць гледача глядзець на свет, на жыццё вачыма мастака, а не самому мастаку глядзець на свет вачыма гледача. У гэтым і заключаецца дыстанцыя ад плаката да сапраўднага жывапісу ў яго істотным значэнні, а не фармальным.

На вельмі добрай карціне В. Волкава «Выступленне Свердлава на гістарычным пасяджэнні ЦК партыі большэвікоў» ёсць выдатная дэталь—шклянка з чаем. На карціне Мадорава «Народнае Сабранне Заходняй Беларусі» у левым кутку—столік з графінам і шклянкамі, на карціне Пашкевіча «Беларускія партызаны на прыёме у Сталіна»—дыван і таксама столік. Але ёсць дэталі, якія гамоняць, і ёсць дэталі, якія маўчаць,—адчуваеш, што яны жывыя, але маўчаць. Дэталь В. Волкава гаманіць, як гамоняць, бадай, кожнай рысай свайго характару і людзі на карціне. Гамоніць дэталь у Пашкевіча. Адчуваеш па скамечанасці дывана, што людзям, якія тупаюць па ім, не да рэчаў матэрыяльнага парадку, што гэтыя людзі бачаць адну рэч—зброю, што яны адухоўлены адной ідэяй—перамагчы ворага. Дэталь у Мадорава маўчыць. Не ўважаючы на тое, што эскізныя партрэты да карціны гавораць аб людзях, якіх мастаку даводзілася наглядаць, можна сказаць, пісаць з натуры,—карціна растварылася ў матэрыяле, у фарбах, знікла. Зусім іншае бачым мы ў В. Волкава. У асобе Дзяржынскага мы бачым светлы вобраз адважнага рыцара рэволюцыі. А які выдатны вобраз Леніна стварыў Волкаў!

Шмат якія няўдачы мастакоў на гэтай выстаўцы ідуць ад недахопу замыслу, ад непранікнення ў чалавечы характар. Коратка: кожны жывапісец павінен быць партрэтыстам. Выпадкова ці не, што мы не бачым на гэтай выстаўцы эскізаў, не бачым, як ствараліся мастаком яго карціны? Магчыма, і выпадкова, магчыма, адсутнасць іх тлумачыцца меркаваннямі памяшкання.

А ўвогуле выстаўка — бясспрэчнае дасягненне мастакоў Беларусі. Першы погляд, накіраваны беларускім мастацтвам у гісторыю сваёй краіны, ужо з'яўляецца ў поўнай меры перамогай. Не след толькі спыняцца на гэтым. У гісторыю, для таго, каб глыбока зразумець яе і адлюстраваць, трэба ўвайсці, як у дом, і пасяліцца там як сталаму жыхару, а не прыходзіць у якасці экскурсанта.

★

РАБОТЫ ІНКРУСТАТАРА Н. ШУДРЫКА

У аддзеле народнай творчасці выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» прадстаўлены работы маладога самавучкі-інкрустатара Н. А. Шудрыка. Яны пакідаюць добрае ўражанне ў гледача.

З малюсенькіх кавалачкаў рознакаляровага дрэва тав. Шудрык па-майстэрску выканаў некалькі партрэтаў. Вось партрэт «Сталін і Варашылаў». З некалькіх сот кавалачкаў фанеры тав. Шудрык даволі ўдала перадаў вядомы фотаздымак «Сталін і Варашылаў».

З усіх работ тав. Шудрыка асабліва вылучаецца з вялікім майстэрствам выканаы партрэт таварыша Сталіна. Сталін на трыбуне, навакол трыбуны палымнеюць сцягі. Перад ім кніга, шклянка, да паловы з вадою... Над гэтым партрэтам таварыша Сталіна інкрустатар Шудрык працаваў чатыры месяцы, складаецца ён з 12 гатункаў дрэва: клёна, бука, арэха, альхі, чынары, бярозы і інш. і мае 610 паасобных дэталей.

Сярод інкрустацыйных работ, экспаніруемых на выстаўцы, работы Н. Шудрыка вылучаюцца лірычнай цеплынёй, арыгінальнасцю. Партрэт таварыша Сталіна яго работы лічыцца адным з лепшых твораў, прадстаўленых на выстаўцы.

Былы выхаванец дзіцячага дома, столяр-самавучка Н. Шудрык стаў добрым майстрам-інкрустатарам, заваяваўшым вядомасць у свайго народа.

М. БАДЗЯЙЛА.

Рабочы сцэны Тэатра оперы і балета БССР.

Хараство совецкай зямлі натхняе мастака

Трыццаць пяць год працуючы выключна ў галіне пейзажа, сузіраючы і ўпарта вывучаючы квітнеючую гамму прыроды ў рознае надвор'е, я, як пейзажыст, імкнуўся ўсімі даступнымі мне сродкамі праўдзіва перадаваць бачымы свет.

Але мала сузіраць і адлюстроўваць,—трэба, каб тваё тварэнне было адухатворана гарачым пачуццём мастака — пачуццём любві да прыроды, каб пейзаж хваляваў сэрца кожнага, хто любіць сваю краіну, свой народ і прыроду. Захапляючая прыгажосць совецкага жыцця натхняе мяне, як пейзажыста, з падвоенай энергіяй працаваць па адлюстраванню велічы і хараства нашай квітнеючай радзімы.

Мастак павінен любіць прыроду. Калгасныя палі, лугі, рэкі, азёры і г. д. мастак-пейзажыст павінен перадаць так, каб гэта было песняй праўды, тады пейзаж не будзе самамэтай і густавым адчуваннем, а рэалістычнай творчасцю.

К выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» мною напісан пейзаж-панарама «БелДРЭС». Я імкнуўся паказаць горад, які вырас сярод лясоў і азёр, на фоне лірычнага пейзажа. Я прыклаў усе мае старанні к таму, каб сумленна вырашыць узятую мною задачу — паказаць адно з дзецішчаў сталінскіх пяцігодак.

Да надыходзячай выстаўкі «Наша радзіма» пішу новыя беларускія пейзажы.

В. КУДРЭВІЧ.

★ ★ ★

Д. Генін

Аб графіцы

Побач з жывапісам і скульптурай на выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» шырока паказана графіка. Яна з'яўляецца адной з найбольш моцных у прафесіянальных адносінах галіной выяўленчага мастацтва БССР прадстаўленых на выстаўцы.

У адрозненне ад мінулых год, калі беларуская графіка пераважна была кніжнай, ілюстрацыйнай, на выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» майстры графікі экспаніравалі станковыя кампазіцыйныя работы, большасць якіх выканана ў матэрыяле (афорт, лінагравюра, ксілагафія і г. д.) Гэта сведчыць аб вялікім росце прафесіянальнага майстэрства і культуры мастакоў-графікаў рэспублікі.

Як іх таварышы ў жывапісу і скульптуры, мастакі-графікі ў сваіх работах паднялі вялікія гістарычныя тэмы. Працуючы над тэматычнымі кампазіцыямі, яны сустрэліся з іншымі, больш высокімі патрабаваннямі, звязанымі з вырашэннем складаных кампазіцыйных задач, майстэрствам рысунка, авалоданнем графічнай тэхнікай, уласцівай таму ці іншаму матэрыялу (медзь, лінолеум, тарцовая дошка, і г. д.) Вырашэнне гэтых задач узняло графічнае майстэрства рэспублікі на больш высокую ступень.

Многія графікі на выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» прадстаўлены цыклам тэматычных кампазіцыйных работ, якія развіваюць адну пэўную тэму. У гэтай сувязі варта адзначыць сем ксілагафій Ібрагіма Гембіцкага на тэму «Разгром белапольскіх акупантаў», шэсць лінагравюр Валянціна Ціхановіча на тэму «1920 год», тры каляровыя лінагравюры А. Тычыны аб сталіцы совецкай Беларусі—Мінску і г. д. Развіваючы ў радзе работ адну тэму, мастакі дабіваліся вырашэння кожнага ліста ў агульным ідэйным і кампазіцыйным замысле ўсяго цыкла.

Калі мастак Гембіцкі вырашае тэму з пункту гледжання вялікіх гістарычных падзей, звязаных з разгромам белапалякаў, і вырашае яе рамантычна (партызанскі рух, Варашылаў і Будзённы на Паўднёва-Заходнім фронце, выступленне В. І. Леніна перад часцямі, якія адпраўляюцца на заходні фронт, уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск і г. д.), дык мастак Ціхановіч вырашае па сутнасці гэтую-ж тэму асобнымі эпізодамі і экспрэсіўна-псіхалагічна (акупанты ў дэфензіва, карацелі, падполле і г. д.). Работы абодвух мастакоў сведчаць аб развіцці іх творчасці. Разам з тым трэба ўказаць на некаторую стракатасць і неўраўнаважанасць чорнай і белай плямы, так недапушчальную ў графіцы, бо толькі ўмелай арганізацыяй і максімальным выкарыстаннем чорнага і белага мастак-графік стварае закончаны кампазіцыйны твор. З гэтага пункту гледжання да ліку лепшых работ мастака Гембіцкага адносяцца: «Захват партызанамі белапольскай разведкі» і «Выступленне В. І. Леніна перад часцямі, якія адпраўляюцца на Заходні фронт», а ў мастака Ціхановіча — «Падполле».

Мастак Барыс Малкін прадстаўлен на выстаўцы радам афортаў, манатыпій і рысункаў на тэму аб дарэволюцыйнай Беларусі. Пераважна гэта архітэктурны пейзаж старога Мінска, пейзаж старой жабрацкай беларускай вёскі. Не гаворачы ўжо аб тэхнічным умельстве ў афорце і манатыпіі, мастаку ўдалося стварыць запамінаючыяся, зробленыя з вялікім настроем пейзажы («Вуліца старога Мінска» — манатыпія, «Беларускі пейзаж» — афорт і інш.). Аднак, мастака трэба перасцерагчы ад гратэску, у які ён часам упадае, па-эстэцку смакуючы старую архітэктуру. З каляровых лінагравюр А. Тычыны аб новым Мінску асаблівай увагі заслугоўвае «Дом Чырвонай Арміі», выкананы ў мяккай і прыемнай охрыста-карычневай гамме. Гэта работа прадстаўляе сабою адзін з лепшых пейзажаў, выкананых у графіцы. Нажаль, у двух яго другіх работах ёсць сур'ёзныя недахопы як у колеры, так і ў рысунку (непрыемныя адносіны шэрага і рэзка-блакітнага ў «Бібліятэцы Леніна»; скажэнні ў перспектыве—узыблены брук у «Совецкай вуліцы»).

Мастак Ю. Краеўскі прадстаўлен на выстаўцы ўжо вядомай гледачу серыяй рысункаў аб мінулым Заходняй Беларусі. Яшчэ раз аддаём даніну захаплення гэтым войстрым і выразным па зместу і майстэрству работам Ю. Краеўскага. Нажаль, мастак выставіў толькі адну новую работу—«Сустрэча», але і яна сведчыць аб тых-жа якасцях добрага рысавальшчыка, якімі ўладае аўтар. Мастаку Краеўскаму варта вельмі сур'ёзна прадумаць пытанне аб вобразе народа і яго трактоўцы. Гратэскова малюючы рысы цяжкога мінулага, варта не выпускаць з-пад увагі галоўнае—сутнасць народа, яго сілу, яго фізічную і духоўную прыгажосць. Гэта тыя якасці, якія робяць народ непераможным, а яго вобраз—неўміручым у вяках.

Таленавітыя майстры афорту мастакі І. Кішчаноўскі, Н. Ландау і Х. Тыбер выставілі шмат новых цікавых работ. Яны таксама адносяцца да ліку лепшых работ на выстаўцы, асабліва гэта датычыць работы І. Кішчаноўскага «Жанчына ў сялянскай міліцыі». Мастак стварыў яркі і моцны вобраз працоўнай жанчыны, поўнай усведамлення сілы вызваленага народа. Моцны малюнак, выразны тыпаж, цікавае кампазіцыйнае вырашэнне, суадносіны светлага і цёмнага (твар, рукі — святло; хустка, плашч, вінтоўка—глыбокі колер сепіі), усё гэта адносіцца да вартасцей указанага афорту мастака Кішчаноўскага. Другая яго работа—«Сялянская міліцыя» таксама цікавая па тыпажу і тэхнічнаму вырашэнню, але мае недахопы ў рысунку (мяцасць і неакрэсленасць форм—далоні ў сядзячых, гратэсковая трактоўка прапорцый рук) і ў кампазіцыі (аднастайнасць паралельных ліній ног і г. д.).

Добры афорт Н. Ландау «Дзяўчына з гароднінай». Праўда, у ім не знойдзены адносіны першага і апошняга плана, што ўразвае фігуру дзяўчыны ў зямлю.

Добрыя і тонкія невялікія афорты Х. Тыбера.

У гэтым артыкуле перавага аддадзена графіцы ў вузкім сэнсе слова—гравюры ў яе розных матэрыялах. І гэта зразумела, бо сапраўдны ўздым і росквіт мастацтва графікі заўсёды звязан з росквітам гравюры. І тое, што на выстаўцы шмат станковай кампазіцыйнай гравюры, насычанай вялікім ідэйным зместам, з'яўляецца яшчэ адным сведчаннем творчага поспеху мастакоў нашай рэспублікі, падрыхтаваўшых выдатную выстаўку «Ленін і Сталін—арганізатары БССР».

Даць творы аб росквіце совецкай зямлі

На выстаўцы выяўленчага мастацтва «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» прадстаўлены мае работы, якія экспаніруюцца ў аддзеле «Старая Беларусь». Мне ў сваіх работах хацелася перадаць настрой старой Беларусі, паказаць бязрадаснасць і цяжар жыцця народа ва ўмовах царскага самадзяржаўя.

Факт адкрыцця велізарнай па маштабах выстаўкі выяўленчага мастацтва БССР — ярчэйшы прыклад клопатаў і ўвагі партыі і ўрада за развіццё мастацтваў. Аб гэтым сведчыць наша выстаўка.

Выстаўка з'яўляецца для ўсіх мастакоў вялікім творчым стымулам. Мяне не пакідае мысль у сваіх новых работах шырока адлюстраваць нашу цудоўную рэчаіснасць.

Б. МАЛКІН.

Я. Шарахоўскі

АБ СТАНОЎЧЫМ ГЕРОЮ

Артыкул другі*)

Вядома, у стварэнні вобразаў станоўчых герояў у совецкіх пісьменнікаў ёсць цяжкасці. Справа ў тым, што ў гэтых адносінах совецкі пісьменнік не можа абаперціся на літаратурную традыцыю. Класічная літаратура была пераважна крытычнай у адносінах да існуючай рэчаіснасці, і станоўчыя героі звычайна адмаўлялі яе, так сказаць, растлумачвалі. Станоўчы герой совецкай літаратуры сцвярджае нашу сапраўднасць, сцвярджае не шляхам растлумачэння, а шляхам практычнага перайначвання, соцыялістычнай перабудовы. Совецкай літаратуры прыходзілася ствараць новую літаратурную традыцыю — традыцыю ўвасаблення вобраза станоўчага героя. Але-ж совецкая літаратура для таго і з'яўляецца самай перадавой літаратурай, каб ствараць новыя літаратурныя традыцыі, адлюстроўваць новыя нормы чалавечых паводзін, якія нараджае наша сапраўднасць.

У чым заключаецца галоўная загана станоўчых герояў нават лепшых твораў беларускай совецкай літаратуры за апошнія часы? Першая загана заключаецца ў тым, што станоўчы герой паказваецца як абстрагіраваны, соцыяльна-абагулены тып, у плане разгорнутай соцыяльнай біяграфіі, але які пазбаўлен асабістай біяграфіі, пазбаўлен характэрных рысаў проста чалавека, якія-б адрознівалі яго ад іншых людзей яго соцыяльнай групы, рабілі-б вобраз глыбока індывідуалізіраваным, непаўторным у сваёй своеасаблівасці і разам з тым тыповым, характэрным для той рэчаіснасці, ва ўмовах якой ён паказваецца.

У гэтых адносінах характэрнаю з'яўляецца структура станоўчага вобраза п'есы К. Чорнага «Бацькаўшчына». Калі Леапольд Гушка збіраецца купляць зямлю, то тут ён не толькі бядняк, які хоча набыць уласны кавалак зямлі, каб вызваліцца ад кулацкай эксплаатацыі, але і жывы чалавек таму, што яго паводзіны не з'яўляюцца абвязковай нормай для ўсіх такіх, як ён, беднякоў. Асабліва ярка гэта выяўляецца ў сцэне, калі Леапольд Гушка здымае з сябе боты, пінжак, шапку і прадае, каб здабыць пяцёрку, якой яму нехапае на задатак за зямлю. Але калі Леапольд Гушка становіцца прыхільнікам соцыялістычнай рэволюцыі, то індывідуальная своеасаблівасць вобраза трацiцца, вобраз звужваецца да пэўнай палітычнай праграмы. Адсь Гушка не мае індывідуальнай характарыстыкі і ва ўмовах дарэволюцыйнай рэчаіснасці.

Характэрным у гэтых адносінах з'яўляецца і вобраз Кацярыны з паэмы П. Броўкі «Кацярына». Тут зноў вобраз будуецца па прынцыпу разгорнутай соцыяльнай біяграфіі, і зноў-жа ён пазбаўлен індывідуальных рысаў, якія-б адрознівалі Кацярыну Броўкі ад іншых Кацярын і якія ў спалучэнні з тыпалагічнымі рысамі стваралі-б тое, што мы называем характарам.

Другою заганаю вобразаў станоўчых герояў нашай літаратуры з'яўляецца тое, што яны не арганізуюць дзеі, сюжэта твора, а звычайна з'яўляюцца толькі для таго, каб разблытаць козні ворагаў, развязаць канфліктныя вузлы. Такі вобраз на працягу твора звычайна не развіваецца, не ўзбагачаецца новым зместам, не выяўляецца як жывы развіваючыйся характар, а з'яўляецца як-бы ўвасабленнем гістарычнай справядлівасці нашай рэчаіснасці. Так пабудаван вобраз сакратара парткома Левановіча ў таленавітай п'есе К. Крапівы «Хто смяецца апошнім», так пабудаван вобраз Дабрыніна ў «Пагібелі воўка» Эд. Самуйлёнка, так пабудаван вобраз начальніка палітаддзела Грушэўскага ў рамане Р. Мурашкі «Салаўі святога Палікара». Гэта ўсё нарматыўныя, застылыя вобразы, якія не маюць асабістага жыцця, індывідуальных рысаў, якія проста спалучаюць у сабе тыпалагічныя рысы сакратара парткома, сакратара райкома, начальніка палітаддзела.

Трэба сказаць, што такі падыход да пабудовы вобраза станоўчага героя хавае ў сабе сур'ёзную небяспеку. Пры такой пабудове вобраза станоўчага героя сюжэт развіваюць звычайна адмоўныя персанажы, яны арганізуюць падзеі і кіруюць імі. Незалежна ад волі і намеру пісьменніка, атрымліваецца зрух на паказ адмоўных з'яў рэчаіснасці. Станоўчыя-ж сілы ў развіцці, у нарастанні не паказваюцца і выглядаюць як раз'яднаныя, альбо да часу наогул знаходзяцца за кулісамі. Такая расстаноўка персанажаў у творы не адлюстроўвае расстаноўкі класавых сіл у жыцці, у рэчаіснасці, развіццё сюжэта і ўзаемаадносін персанажаў не адлюстроўвае працэсу рэальнай класавай барацьбы. Інакш кажучы, рэчаіснасць у мастацкім творы ўстае перад намі ў скажоным, аднабокім выглядзе.

Пісьменніцкай грамадскасці трэба з асаблівай насцярожанасцю паставіцца да небяспекі такой пабудовы вобраза станоўчага героя. Тым больш, што ў нас ахвярай гэтай небяспекі паў ужо Р. Мурашка ў рамане «Салаўі святога Палікара».

Сапраўды, што выйшла у Р. Мурашкі? Сюжэт яго твора вядуць наперад адмоўныя персанажы, кіруюць падзеямі кулакі Храпавіцкія, Мысліцкія, Салаўі. Яны надзвычай дружныя, арганізаваныя, стаяць адзін за другога. Станоўчыя персанажы—Гарбач, Анішчык, Грушэўскі, Харошка, якія ўвасабляюць сабою станоўчыя сілы нашай рэчаіснасці,—раз'яднаныя, беззапаможныя. Спасылка на тое, што ў перыяд, які паказваецца ў рамане, адмоўныя сілы сям-там маглі рабіць свае варожыя справы, не можа служыць тут ніякім апраўданнем. Не можа служыць ніякім апраўданнем таму, што ў рамане не адчуваецца калгаснай масы, няма яе рэагіравання на варожыя справы кулакоў. Калі калгаснікі да часу не адважваліся рэагіраваць сярод калгаснай грамадскасці, то абмяркоўваць калгасныя справы ў сям'і, з блізкімі сябрамі яны абавязкова павінны былі. А так што атрымліваецца? Кулакі падпалілі калгасны двор, а ніякага рэагіравання на гэты варожы акт з боку калгаснікаў няма. Ніхто не абзываецца аб гэтым ніводным словам. Кулакі разбілі галаву Гарбачу, сакратару комсамольскай ячэйкі, ён ляжыць хворы і да яго нават ніхто не наведаецца. Дзе-ж яго комсамольцы? Няўжо ён такі далёкі для ўсіх калгаснікаў? Калі Анішчык знемагае ў барацьбе з кулакамі, якія верхаводзяць калгасам, сельсоветам, то чаму не відаць дзесяткаў такіх Анішчыкаў, якія ёсць у калгасе, але якія пакуль што не адважваюцца выступіць супроць кулакоў?

Усё гэта хібы, абумоўленыя нарматыўнаю, не дынамічнаю пабудоваю вобраза станоўчага героя. І, як паказвае раман Мурашкі, пісьменнік можа трапіць у такое становішча, калі справе не дапамогуць сапраўды па-мастацку выпісаныя вобразы асобных станоўчых персанажаў (вобраз Анішчыка, надзвычай паэтычны вобраз дзяўчыны-комсамолкі Зоі Харошкі). З усяго сказанага, трэба спадзявацца, зразумела, чаму ў рамане Мурашкі так згушчаны цёмныя фарбы і так мала светлых.

Адзіным чалавекам, які жыве поўнацэнным жыццём, у рамане Мурашкі з'яўляецца Яніна. На гэтым вобразе варта спыніцца падрабязней. Гэты вобраз адразу заваёўвае сімпатыі чытача стыхійнаю сілаю сцвярджэння жыцця. З усіх вобразаў рамана гэты вобраз напісан з найбольшай мастацкай сілай. І ўсё-такі хочацца, каб у паказе Яніны было менш падкрэслівання «дужыні» і крыху больш мары, парыву насустрач новаму жыццю, да якога яна ідзе, вырваўшыся з клубка вужак.

У чым каштоўнасць гэтага вобраза, калі не гаварыць аб чыста мастацкіх вартасцях? Каштоўнасць яго ў тым, што Яніна паказана ў развіцці, прычым у развіцці ў станоўчы бок. Вось гэта якраз і патрэбна зараз нашай літаратуры. Пісьменнікі зараз павінны завайстрыць сваю ўвагу не толькі на паказе ў поўным сэнсе станоўчага героя, але і на паказе вобразаў людзей, якія робяцца ў поўным сэнсе станоўчымі, якія зжываюць прывычкі, погляды, маральныя ўяўленні, атрыманыя ў спадчыну ад буржуазнага грамадства, вобразы людзей, якіх перайначвае комуністычнае выхаванне.

Што-ж патрэбна пісьменніку, каб справіцца з задачаю стварэння поўнацэнных вобразаў станоўчых герояў і герояў, якія робяцца станоўчымі? Кажучы проста, пісьменніку трэба вырвацца наперад. Патрэбна вялікая агульнакультурная вучоба і творчае вывучэнне марксізма-ленінізма. Марксізм-ленінізм—гэта вока, якое найбольш глыбока пранікае ў сапраўднасць, і калі гэта вока зробіцца вокам пісьменніка, то ён справіцца з сваімі задачамі. Работа пісьменніка па стварэнню вобраза станоўчага героя будзе тым больш плённай, чым больш станоўчы герой будзе расці ў самім пісьменніку, г. зн. чым больш ён будзе вызваляцца сам ад спадчыны мінулага, чым больш перадавым чалавекам ён будзе рабіцца. Тады станоўчы герой нашага часу будзе яму настолькі блізкі, што ён будзе пазнаваць у яго ўчынках свае ўчынкі, у яго думках свае думкі.

Ёсць яшчэ адно пытанне, якое з'яўляецца надзвычай актуальным для нашай літаратуры,—гэта праблема аўтарскіх адносін. Совецкі пісьменнік не можа быць аб'ектывістам, бесстароннім сведкаю падзей, якія разгортваюцца ў мастацкім творы. Ён павінен выявіць свае адносіны, свае сімпатыі, твор павінен быць тэндэнцыйным. Але свае сімпатыі аўтар павінен выяўляць, і мы гэта падкрэсліваем, мастацкімі сродкамі. Тут не патрэбна грубая прастолінейнасць, не патрэбна вонкава-біялагічная дыскрэдытацыя адмоўнага персанажа, калі ён паказваецца ледзь не фізічным уродам. Цэнтр цяжару ў аўтарскіх адносінах да персанажаў трэба перанесці на духоўнае, маральнае, ідэалагічнае раззбраенне варожага свету. Трэба дамагчыся, каб нашы пісьменнікі іменна так разумелі праблему тэндэнцыйнасці і не прыводзілі ў сваіх творах груба прастолінейнай, вонкава-дыскрэдыцыйнай тэндэнцыйнасці. А на сёнешні дзень у нас ёсць такія творы. У першую чаргу гэта «Хлопчык з-пад Гродны» З. Бядулі, дзе варожы свет паказан у выглядзе нейкіх выраткаў, дзе леснікі за кусток травы кусаюць дзяцей, як сабакі, дзе паны беспакарана душаць аўтамабілямі людзей, дзе хутаранцы за нішто са стрэльбамі кідаюцца на жанчыну з дзіцем, дзе турэмны вартаўнік прадстаўлен у выглядзе нейкага дзікуна. Шкодзіць дыскрэдыцыйная тэндэнцыйнасць і раману М. Пасляковіча «Паўстанне».

Адным з лепшых узораў вырашэння праблемы тэндэнцыйнасці ў совецкай літаратуры з'яўляюцца творы Н. Астроўскага «Як гартавалася сталь» і «Народжаныя бурай». Вывучэнне вопыту гэтага пісьменніка можа аказаць значную творчую дапамогу беларускім совецкім пісьменнікам.

*) Пачатак у № 36 «ЛІМ».



К 85-годдзю з дня смерці польскага народнага паэта Адама Міцкевіча ў гор. Навагрудку, Баранавіцкай вобласці, на радзіме паэта, у доме яго бацькоў будзе адкрыт мемарыяльны музей яго імя. У музеі сабрана ўжо каля 1.000 экспанатаў, звязаных з жыццём і творчасцю вялікага паэта. **На здымку:** апошнія падрыхтаванні к адкрыццю музея.

Фота В. Лушейкі (БелТА).

Адам Міцкевіч

З „КРЫМСКІХ САНЕТАЎ"

Акерманскія стэпы

Я выплыў на прастор сухога акіяна;
Воз, як лодка, бродзіць, у зелені нырае,
У паводцы кветак і хваль стэпаў, мінаю,
Удалі караловыя астравы бур'яна.

Змрокападае; ні дарогі, ні кургана.
Для лодкі пуцяводных ў небе зор шукаю;
Там воблака блішчыць? Дня золак там палае?
Днестр гэта, і ўзыходзіць лямпа Акермана.

Спынімся — Як ціха! — Жураўоў лёт чую,
Якіх-бы нават быстры сокал не ўгледзіў;
І як матыль калыша траву стэпавую,

І як вуж па зямлі слізгаецца недзе.
У гэткай цішыні так чутка ўсё лаўлю я,
Што чуў-бы з Літвы голас. — Ніхто не кліча, едзем!.

Бура

Мачты палі, руль трэснуў, рык хваль, шум завеі,
Крык трывожны людзей, енк злавесны насосаў —
Апошнія канаты рвуцца з рук матросаў —
У крыві сонца заходзіць, з ім рэшта надзеі.

Вецер завыў з трыумфам, па горах салёных,
Што з хаосу марскога паверхамі ўсталі,
Геній смерці ішоў да карабля праз хвалі,
Як салдат штурмуючы пралом бастыёна.

Адны, як нежывыя, паляглі ў трумах,
Ці з прыяцелямі развітваюцца, млеюць,
Другія смерці здань малітвай адганяюць.

Толькі адзін падарожны сядзеў і думаў:
Шчаслівы той, хто сілы згубіў, ці умее
Маліцца, альбо з кім развітвацца мае.

Пераклаў М. ТАНК.

Перад юбілеем Адама Міцкевіча

Камісія па правядзенню 85-гадовага юбілея з дня смерці Адама Міцкевіча прыняла план літаратурных вечароў памяці вялікага паэта польскага народа.

26 лістапада бягучага года ў гор. Новагрудку, на радзіме паэта, адбудзецца ўрачысты сход пры ўдзеле Саюза пісьменнікаў, Акадэміі навук і Наркамасветы БССР. З дакладам аб творчасці паэта выступіць Пятро Глебка. Беларускія, рускія і яўрэйскія паэты прачытаюць пераклады твораў Міцкевіча.

У канцэрце, які адбудзецца пасля даклада, прымуць удзел артысты Дзяржаўнага Польскага тэатра БССР, Дзяржаўнага Беларускага драматычнага тэатра, салісты Тэатра оперы і балета, хор і салісты філармоніі.

26 лістапада ў Новагрудку адкрываецца літаратурны музей імя Адама Міцкевіча.

Для ўдзелу ва ўрачыстым сходзе ў Новагрудак з Мінска і Беластока прыедуць пісьменнікі: Якуб Колас, Міхась Лынькоў, Філіп Пестрак, Змітрок Бядуля, Яніна Бранеўская, Максім Танк, Кандрат Крапіва і інш.

30 лістапада вялікі літаратурны вечар памяці паэта адбудзецца ў Мінску, у Доме партыйнай асветы.

М.

Высокамастацкія творы—дзецям

На сходзе пісьменнікаў, якія пішуць творы для дзяцей, даклад аб выданні літаратуры для дзяцей зрабіў днямі тав. Канавалаў. Даклад слухалі з увагай. Сектар дзіцячай літаратуры — адзін з найбольш працаздольных ў Дзяржаўным выдавецтве. Пісьменнікі з ахвотай нясуць туды свае рукапісы. У гэтым сектары чулая, ветлівая і патрабавальная рэдактура.

У гэтым годзе найбольш частыя наведвальнікі сектара — Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, П. Броўка, пісьменнікі заходніх абласцей.

Не ўсе пісьменнікі 'адчуваюць адказнасць перад юнымі чытачамі. Паэт Хаім Мальцінскі прынёс у выдавецтва сырую, недапрацаваную п'есу «Майстры на ўсе рукі». Павел Лсвановіч — малады празаік — таксама ставіцца да чытача без належнай павагі. У яго творах многа неахайнага, адсутнічае элементарная пісьменніцкая культура.

Ёсць і такія пісьменнікі, што здаюць заяўкі ў выдавецтва на кнігі, якіх яны не пішуць. Такія пагрэшнасці супроць плана зрабілі нават вядомыя дзіцячаму чытачу пісьменнікі, як Янка Маўр, Алесь Якімовіч.

Даклад абмяркоўвалі А. Кучар, І. Гурскі, З. Бядуля, Янка Маўр, В. Вольскі, З. Цялесін і інш.

Таварышы не згадзіліся з некаторымі палажэннямі даклада. Т. т. З. Бядуля і В. Вольскі не згадзіліся з дакладчыкам у тым, што ў нас «засілле» казачнага жанру ў дзіцячай літаратуры. Тав. І. Гурскі выказаў думку аб неабходнасці выдання манаграфій асобных пісьменнікаў. Справядлівыя папрокі былі зроблены журналу «Іскры Ільіча» і тав. Цялесіну — сакратару рэдакцыі журнала. У журнале многа неахайнага, недарэчнага. З. Бядуля выказаў агульную думку схода, паставіўшы пытанне аб стварэнні мастацкага савета пры выдавецтве.

У новае бюро секцыі дзіцячай літаратуры на сходзе выбраны В. Вольскі, Янка Маўр, Алесь Якімовіч.

Ф. К.

І. Рэзнік

М. ДЗЕХЦЯР

14 лістапада 1939 года памёр малады таленавіты празаік М. Дзехцяр.

Дзехцяр памёр ва ўзросце 29 год. Ён нарадзіўся ў мястэчку Пціч, на Палессі, у сям'і шаўца. К дваццаці годам Дзехцяр скончыў у Мінску курсы будаўнікоў, к гэтаму-ж часу адносяцца яго першыя апавяданні. У 1938 годзе Дзехцяр скончыў літаратурны факультэт Педагагічнага інстытута. На апошнім годзе свайго жыцця Дзехцяр пайшоў служыць у Чырвоную Армію.

Такая скромная біяграфія простага хлапца з рабочай сям'і на Палессі, які ўласнай працай і талентам дабіўся аднаго з пачэсных месц у маладой яўрэйскай савецкай прозе.

Дзехцяр выдаў усяго два зборнікі апавяданняў: першая кніга — «Будаўнікі» вышла ў 1936 годзе, другая «На роднай зямлі»—у 1939 годзе. Велізарныя залежы жыццёвага матэрыялу, безліч жывых эпізодаў, мноства паэтычных замыслаў, рэалізаваных і нерэалізаваных, заключаюць у сабе апавяданні Дзехцяра. У ім жыў творчы неспакой сапраўднага мастака, якога ні адна падзея савецкай рэчаіснасці не магла пакінуць абыякавым. Аб чымбы ні пісаў Дзехцяр, якія-б тэмы ні закранаў ён у сваіх апавяданнях, усюды, нават у апавяданнях аб смерці, адчуваецца любоў і імкненне да жыцця, да самага яркага, неўгамоннага, непакойна-жывога, што ёсць у жыцці.

Любоў да жыцця настолькі вялікая, што ў адной з сваіх лепшых навел — «Помнік»—пісьменнік прымушан спыніць лагічную тканіну апавядання нечаканай фразай—воклічам: «Мне здаецца, што я ніколі не памру...» Праз тэму смерці Дзехцяр выразіў свае актыўныя, жыццёсцвярджаючыя адносіны да свету.

У апавяданні «Цымбалы» памірае цымбаліст Аніска, які музыкай весяліў сэрцы народа. Смерцю любімага музыканта засмучана ўся вёска: «На імгненне спыніліся сярпы, і касцы спынілі сваю ціхую песню...» Але Аніска не памёр адзінокім—«столькі прыяцеляў і таварышоў сышлося над угаманіўшымся Аніскам, так многа знаёмых і блізкіх вёсак стала ля яго галавы». Над магілай цымбаліста задушэўную прамову сказаў брыгадзір Лукаш. «Цымбалы Аніскі будуць гучаць,—сказаў Лукаш,—яны не змоўкнуць...» Як дзіўна падобны лёс героя на лёс самога мастака!

У навеле «Помнік» памірае стары інструктар-будаўнік Хема Маляўскі. Дзесяць маладых будаўнікоў, вучняў старога майстра, з вялікім болем перажываюць смерць таго, хто вёў іх у жыццё, хто прывіў ім любоў да натхнёнай працы. Сам пісьменнік—у ліку дзесяці будаўнікоў. Ад іх імя ён піша апавяданне. Маляўскі памёр як герой, ён сам сваёй сумленнай, натхнёнай працай пабудаваў сабе помнік. Маляўскі зрабіў жыццё багацейшым, прыгажэйшым—у гэтым сакрэт яго бессмяротнасці. «Як вечны бессмяротны помнік запрамянілася над горадам наша радасная маладосць»—так паэтычна заканчвае сваё апавяданне Дзехцяр. Так аптымістычна ўспрымае праблему смерці малады пісьменнік: калі паміраць, дык у імя будучага, калі гінуць, дык так, як Маляўскі, замуроўваючы цэгліны ў велічны будынак будучага.

Для Дзехцяра была зусім арганічнай тэма савецкай рэчаіснасці. Гэта тэма не зададзена знешне, яна—паветра, якім дыхае паэт, яна абумоўлівае фарміраванне яго ўнутранага вопыту. У Дзехцяра было шчаслівае ўменне звычайныя, здавалася-б, рэчы, паказваць у такім святле, калі яны праяўляюць велізарны паэтычны сэнс. Ён умеў абагульняць радавыя з'явы жыцця. Гэта асаблівасць пісьменніцкага дараваня Дзехцяра з'яўлялася вынікам яго незвычайна сумленных, у вышэйшай ступені паэтычных адносін да рэчаіснасці. Вось чаму амаль усе бытавыя жанравыя навелы Дзехцяра незвычайна яркія, паэтычныя. Возьмем, к прыкладу, апавяданні Дзехцяра аб старых, аб старасці. Такіх апавяданняў у яго шмат і амаль усе яны вылучаюцца той-жа любоўю да жыцця, тым невычарпальным тэмпераментам, які літаральна захлёствае творчасць Дзехцяра. Старыя персанажы маладога пісьменніка— людзі працы, ім не так лёгка пайсці на адпачынак, на «пенсію», яны імкнуцца да актыўных форм жыццёдзейнасці. Такі атынкоўшчык Герш Ліпак (апавяданне «Герш-атынкоўшчык»), такі стары Пейсі, які вельмі ўсцешан тым, што яму ўдалося напаіць цэлы ўзвод чырвонаармейцаў спюдзёнай вадою з уласнага калодзежа (апавяданне «Ля калодзежа»). Пісьменнік рысуе «радавыя» факты, падзеі, але ўсе яны дыхаюць нейкай незвычайнай інтымнасцю, нібы пісьменнік застаўся з вокана-вока са сваімі старымі і ў ціхай задушэўнай гутарцы падслухаў іх затоеныя мары.

У апавяданнях Дзехцяра вялікае месца займае тэма дружбы. Асабліва моцнае выражэнне атрымала тэма інтэрнацыянальнага садружаства ў апавяданні «Тры браты». У ім, як і ва ўсіх лепшых творах Дзехцяра, выражана натхнёная любоў маладога пісьменніка да соцыялістычнай рэчаіснасці, здзіўленне перад высокімі маральнымі якасцямі нашых людзей, арганічная блізкасць к народу. Героі апавяданняў Дзехцяра паказаны нібы ў двух планах: у плане бытавым, рэальным і ў плане напоўказачным; адзін і той-жа чалавек — зусім рэальная бытавая асоба і адначасна рыцарычная фігура натхнёнага летуценніка. Але іменна таму, што вобразы Дзехцяра нараджаліся жывым і спелым пачуццём, сапраўды творчым натхненнем, таму і яго чалавечыя фігуры ніколі не ператвараліся ў адцягненыя абстракцыі, у сімвалы прыгожых, але не сапраўдных страсцей і пачуццяў. У гэтых адносінах вельмі характэрна апавяданне «Тры вартаўнікі», дзе арганічна зжыліся два творчых погляды пісьменніка: погляд бытапісацеля-рэаліста і погляд рамантыка-паэта. Дзехцяр рамантызіруе сваіх герояў, ён фантазіруе і марыць разам з імі. Іншы раз, не даючы знешняй характарыстыкі сваіх персанажаў, пісьменнік умела паказвае багаты ўнутраны свет чалавека. Для прыкладу можна прывесці вобраз брыгадзіра Лукаша («Цымбалы»), чый шматгранны характар раскрываецца ў яго мужным і чалавечным выступленні над свежай магілай цымбаліста Аніскі.

Апавядальная манера Дзехцяра вылучалася спалучэннем сугуба-рэалістычных элементаў з пранікнёным паэтычным лірызмам. Высокае лірычнае гучанне часта прымушае нас чытаць апавяданні Дзехцяра як вершы, у якіх, як і ў кожным паэтычным творы, асабістая аўтарская ўсхваляванасць пераважае над уласна-апавядальным элементам.

Справядлівасць патрабуе адзначыць, што рамантычны стыль Дзехцяра часта перашкаджаў пісьменніку пабудаваць стройны драматычны сюжэт. Дзехцяр не заўсёды спалучаў паэтычны лірызм з патрабаваннямі мастацкай аб'ектыўнасці. І творчы рост Дзехцяра ішоў па напрамку, вызначанаму яго лепшымі і найбольш спелымі апавяданнямі, дзе цэласнае пісьменніцкае ўражанне нараджала такую-ж цэласную, закончаную ў сваіх праявах аб'ектыўную карціну жыцця. У гэтым сэнсе другая, пасмертная кніга Дзехцяра «На роднай зямлі» стаіць непамерна вышэй яго першага зборніка «Будаўнікі».

Творчасць М. Дзехцяра выражала рэальныя ўзаемаадносіны, характарызуючыя соцыялістычную рэчаіснасць. У асобе Дзехцяра яўрэйская савецкая літаратура страціла незвычайна таленавітага, шпарка растучага мастака.



Па сцэнарыю ордэнаносцаў Б. Левіна і П. Паўленкі ў кіностудыі «Саюздзетфільм» здымаецца мастацкі гістарычны фільм «Якаў Свердлаў». Рэжысёр — засл. дзеяч мастацтваў РСФСР ордэнаносец С. Юткевіч, аператар — ордэнаносец Л. Мартаў. **На здымку** — кадр з фільма: В. І. Ленін каля хворага Свердлава. У ролі Леніна засл. артыст РСФСР ордэнаносец **М. Штраух,** у ролі Свердлава засл. артыст РСФСР ордэнаносец **Л. Любашэўскі.**

Фота ТАСС.

„МУЗЫКАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ"

Жанр музыкальнай камедыі—не новы жанр у нашай кінематаграфіі. Многія рэжысёры спрабавалі свае сілы ў гэтым жанры. Фільмы Александрава, Пыр'ева, Корша і інш., пры ўсіх сваіх недахопах, з'яўляліся як-бы першымі ступенькамі ў развіцці музыкальнай камедыі. Яны паказалі, што гэты жанр мае права на жыццё, што савецкі глядач любіць карціны, у якіх музыка з'яўляецца не толькі фонам, а займае пануючае становішча. Аднак, амаль ва ўсіх фільмах апошняга часу («Любімая дзяўчына», «Мая любоў» і інш.) музыка не была арганічна ўсяму зместу, сюжэту рэчы, а з'яўлялася пэўнай ілюстрацыяй паводзін герояў, а часам давалася і проста ў выглядзе ўстаўных атракцыёнаў.

Паяўленне на нашых экранах такіх замежных фільмаў, як «Сто мужчын і адна дзяўчына» і, асабліва, «Вялікі вальс», паказала, што наша кінематаграфія, даўшая рад выдатных эпічных палотнаў («Чапаеў», «Шчорс», «Мы з Кранштадта» і інш.), вельмі адстала ў развіцці жанра музыкальнай камедыі. Намі абсалютна не выкарыстана багатая музыкальная спадчына, жыццё і творчасць вялікіх рускіх і нацыянальных кампазітараў.

«Музыкальная гісторыя», фільм вытворчасці ордэна Леніна кіностудыі «Ленфільм», вышаў днямі на экраны Савецкага Саюза. Гэта радасная падзея ў кінематаграфіі. Аўтары фільма (сцэнарый Е. Пятрова і Г. Мунбліт, рэжысёры — Іваноўскі і Рапапорт) сталі на правільны шлях і стварылі вясёлую камедыю, музыкальную не толькі па назве, а па сутнасці. Гэта фільм аб народных талентах, перад якімі ў соцыялістычнай краіне адкрыта шырокая дарога для развіцця здольнасцей. «Музыкальная гісторыя» Пеці Гаваркова, гэта жыццёвая гісторыя дзесяткаў маладых таленавітых людзей нашай радзімы. І ў гэтым вялікая праўдзівасць кіноленты, яе эмацыянальнае пераканаўчае гучанне. У сэрцы герояў фільма жыве вялікая любоў да музыкі, і музыка рухае сюжэт твора наперад, музыка афарбоўвае сюжэт у паэтычныя фарбы.

Музыкальны фільм павінен спрыяць павышэнню музыкальнай культуры, прывіваць любоў да музыкі. У «Музыкальнай гісторыі» якраз багата і трапна выкарыстаны творы Чайкоўскага, Рымскага-Корсакава, Бізэ, Барадзіна. Музыка, якая тут з'яўляецца састаўной часткай сюжэта, а не фонам (як гэта звычайна бывае ў фільмах), безумоўна эмацыянальна ўздзейнічае на тых, хто «слухае» гэты фільм.

С. Лемешаў упершыню выступае як кіноактор. Дэбют атрымаўся вельмі ўдалым. Лемешаў паказаў сябе як выдатны камедыйны лірычны актор, актор тонкі, удумлівы, тэмпераментны. Створаны ім вобраз шафёра Пеці Гаваркова запамінаецца. Ясны, просты характар Пеці падкупляе, яго паводзіны арганічны, непасрэдны без непатрэбнай абернай напышлівасці. Яго імклівасць, упартасць у дасягненні мэты (шафёр — студэнт кансерваторыі — саліст оперы), яго непадкупная прастата і ўпэўненасць у жыцці надаюць і ўсёй карціне светлы, радасны тон аптымізму.

Актор Канавалаў бліскуча справіўся са сваёй роляй. Стары музыкант Васіль Фаміч Македонскі — сапраўдны энтузіяст музыкі, выхавацель таленавітых людзей. Яго радасць, калі ён «знайшоў» музыкальны самародак, і рашучасць, з якой ён «прасоўвае» Пецю, усе яго паводзіны авеяны вялікай шчырасцю і любоўю да мастацтва. У гэтым вобразе актор здолеў перадаць надзвычайныя, благародныя рысы характару савецкага грамадзяніна.

Выкананне ролей Альфрэда Тараканава (арт. Эраст Гарын) і Клавы Белкінай (арт. Зоя Фёдарава) па сваёй якасці ніжэй адзначаных вышэй. Але тут вінаваты хутчэй аўтары сцэнарыя, якія не далі гэтым таленавітым акторам высокаякаснага матэрыялу для ігры. З мешчаніна Тараканава можна было зняць маску больш рэалістычнымі сродкамі.

Фільм рэжысёрска зроблен вельмі добра. Шмат выдумкі, камедыйных знаходак, бліскучых паваротаў. Надоўга запомніць глядач начную паездку ў машыне па гораду Гаваркова і Македонскага, выступленне Пеці на клубнай сцэне, калі ўся рабочая аўдыторыя падказвае яму тэкст твора, і інш.

Як недахоп, хутчэй як папрок рэжысёрам, трэба адзначыць, як гэта ні дзіўна, празмерную вакальную культуру Пеці. Думаецца, было-б лепей, калі-б Пеця ў пачатку спяваў горш, альбо каб песні яго былі не з класічнага рэпертуару. Ён мог-бы спачатку прадэманстрыраваць свае здольнасці на выкананні народных песень. Гэта больш падкрэслівала-б яго сувязь з народам і яшчэ больш яркім стаў-бы яго далейшы рост.

Трэба спадзявацца, што «Музыкальная гісторыя» паслужыць штуршком у далейшым развіцці жанру музыкальнай камедыі.

М. БЛІСЦІНАЎ.

Л. Бараг

МІХАСЬ МАШАРА

Міхась Антонавіч Машара нарадзіўся ў 1902 годзе ў сям'і беднага селяніна вёскі Таболы, Глыбоцкага раёна Вілейскай вобласці. Адукацыю атрымаў у пачатковай сельскай школе. У гады грамадзянскай вайны Міхась Машара служыць добраахвотнікам у Чырвонай Арміі. Затым некалькі год працуе на сельскай гаспадарцы, з'яўляючыся актыўным дзеячам Беларускай работніцка-сялянскай грамады, разгромленай польскай уладай у 1927 годзе. У гэтым годзе М. Машара рэдагаваў у Вільні рэвалюцыйную беларускую газету «Наша воля». У сакавіку 1927 года рэвалюцыйная і журналісцкая дзейнасць Машары была спынена арыштам. 30 месяцаў прасядзеў ён у віленскай турме Лукішкі. Як і Танк, Машара стаў паэтам у турме. Адсюль ён паслаў свае першыя вершы ў беларускія журналы «Шлях моладзі», «Беларускі летапіс», «Калосся». Па выхадзе з турмы Машара пасяліўся ў роднай вёсцы Таболы, дзе займаўся сельскай гаспадаркай. Адначасна працаваў над зборнікамі вершаў: «На сонечны бераг» (1934), «На праdвесні» (1935) і «З-пад стрэх саламяных» (1937). Апошнія месяцы перад вызваленнем Заходняй Беларусі паэт працаваў на чыгуначным будаўніцтве. У кастрычніку 1939 года Машара быў выбран дэпутатам Народнага сабрання Заходняй Беларусі, а затым членам Поўнамоцнай камісіі Народнага сабрання.

У вершы «Таварышу Сталіну», прачытаным Машарай з трыбуны Народнага сабрання Заходняй Беларусі, паэт абвяшчае:

Былі нашы будні бязвольным паходам,
Страціў надзею працоўны народ.
Дваццаць гадоў мы чакалі прыходу,
З верай вялікай глядзелі на ўсход.
. . . .
Думалі — гэта няволя ўжо вечна...
Думалі — згіне зямля і народ.
Ніжэй згіналісь працоўныя плечы
Усё-ткі з надзеяй —
І толькі надзея была на усход.

Смутак аб гінучай пад панскім ярмом радзіме і незгасаючая вера ў яе рэвалюцыйнае вызваленне — спалучэнне гэтых процілеглых настрояў вызначыла своеасаблівасць паэзіі Машары 1930-х год.

Мары Машары аб вызваленні заходнебеларускай зямлі — гэта рамантычныя мары аб сонцы, перададзеныя ў некалькі абстракатнай форме, асабліва ў ранніх творах паэта:

Наперад, — хай бура нясецца,
Хай б'юцца, рагочуць віхры.
Наперад!.. Там сонца смяецца!
Наперад! Да сонца туды!..
(Уступ да зборніка «На сонечны бераг»).

Праз усю творчасць Машары праходзіць вобраз вандроўніка «з грудзьмі, поўнымі кахання», які ідзе праз усе перашкоды да сонечнага шчасця. У зборніку «На сонечны бераг» смелы вандроўнік-жабрак выступае на фоне яркай, радаснай прыроды:

Галаву прыкрыўшы небам,
З кіем, босы, па пяску,
Я пайду з вандроўным дзедам
Адганяць ад сёл тугу.
Люба шыр мне... Лес смяецца
Ціхім шэлестам лісця.
Людзі, людзі, вашы сэрцы
Прагнуць радасці жыцця.
(«З торбы вандроўніка»).

У зборніку «На прадвесні», побач з падобнымі аптымістычнымі вершамі, мы ўжо сустракаем журботныя вершы аб надоўгай вясне, аб мінуўшых радасных днях, аб згаслых зорках.

У кнізе «З-пад стрэх саламяных», выданай у 1937 годзе, калі пасля нядоўгага рэвалюцыйнага ўздыму ў Польшчы перамагла рэакцыя, матывы адцвітання і непагоды высоўваюцца на першы план. У вершах на гэтыя матывы паэт нярэдка гаворыць аб беднасці і прыгнечанні, у якіх знаходзілася заходнебеларускае сялянства. Такім чынам, сімвалічныя вобразы восені і зімы атрымліваюць тут значэнне рэальнага фону. Сімвалічнае зліваецца з рэальным, блокаўскія матывы — з некрасаўскімі:

Сыпяцца, сыпяцца белыя,
белыя краскі зімы,
так мы душой сталі бедныя,
бедныя дзеці зямлі.
. . . .
Тыя ад веку праклятыя,
іх нат' людзьмі не завуць.
слёзы іх ветры крылатыя
белым сняжком замятуць.
Спюдзена, спюдзена, родныя,
надта на нашай зямлі,
мо' ад таго так, пакорныя,
усе мы душой знемаглі.

Такія вершы, ярка выражаючыя непрынящце польскай рэакцыйнай рэчаіснасці, будзілі гуманістычны пратэст. Аднак, на такім смутным фоне лірычны герой Машары — вандроўнік, які шукае шчасця свайму народу, — траціць баявы характар і набывае рамантычную зданнёвасць у духу блокаўскіх вершаў аб прыгожай даме.

У некаторых вершах зборніка «З-пад стрэх саламяных» Машара, падобна дарэвалюцыйным рускім сімвалістам, ператварае сапраўднасць у прыгожую, феерычную казку і нават абвяшчае адыход ад людзей з іх земнымі клопатамі і страсцямі.

Што мне людзі? бяда і пытанні?
Што іх шчасце?.. мана і дакор.
Кожну ночку цяпер з салаўямі
Салаўіны вяду разгавор.
(«З салаўямі вяду разгавор»).

Побач з традыцыйнымі сімвалісцкімі вобразамі ў вершах трэцяй кнігі Машары нямала арыгінальных паэтычных карцін, — напрыклад, у вершах «Мяцеліца», «Сонячы лебедзь» і інш. Паварот Машары да інтымнай лірыкі і яго вучоба ў сімвалістаў пэўным чынам спрыялі адыходу яго ад рыторыкі і разважлівасці, якія не былі чужды яго раннім вершам.

Аднак, паэт знайшоў у сабе даволі сіл, каб перамагчы настроі смутку і адзіноты, навеяныя рэакцыйнай рэчаіснасцю. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага заходнебеларускага руху, цесна звязаны з сялянскімі масамі, ён не мог прыняць свету ілюзій, не мог адарвацца ад рэальнай земнай глебы. Характэрна, што побач з вершам «З салаўямі вяду разгавор», у кнізе «З-пад стрэх саламяных» змешчан верш «Між калосся», у якім абвяшчаецца служэнне радзіме:

Не хачу да зор — у неба,
Да зямлі я тут прырос,
Тут жадаю жыць, як трэба,
І змагацца за свой лёс.

У тым-жа зборніку мы сустракаемся з вершамі, якія сцвярджаюць непахісную барацьбу і рэвалюцыйнае дзярзанне.

Для творчасці Машары 1938—1939 год (да 17 верасня) эстэтызм і настроі асуджанасці з'яўляюцца ўжо, у асноўным, пройдзеным этапам. Сімвалісцкі вобраз зімы раскрываецца ім цяпер у новым, аптымістычным плане:

Я знаю, што гэта не смерць над краінай,
а толькі зіма,
як штогод над зямлёй.
Вясны дачакае, хто моцны і звінны,
хто сэрца напоіць з крыніцы жывой.
(«Ваколіца сініх балот», студзень 1939).

Пафас рэвалюцыйнай барацьбы зліваецца ў вершах Машары з працоўным пафасам. Характэрны ў гэтых адносінах, напрыклад, яго раннія вершы: «Каваль» (1934), «Сенажаць» (1934), «На руме» (1934) і інш.

У кнізе «З-пад стрэх саламяных» адчуванне радасці працы перададзена ў выразных і свежых вобразах:

У кашулі бела-палатнянай
З сяўнёй я выйшаў на раллю
І над аджыўшымі палямі
Аўсяным золатам звaню.
Як цень, брыдзе за мною следам
Сялянскі конь у баране
І цёплым ласкавым прыветам
Чуць-чуць махае грывай мне.
А сонца лезець без патрэбы
У вочы, твар і валасы,
І поле пахне свежым хлебам
І хмелем першае расы.
(«На раллі», 1937).

У адрозненне ад многіх іншых паэтаў сялянскай Беларусі, перад Машарай не стаяла праблема прыняцця ці непрыняцця індустрыяльнай перабудовы адсталай краіны балот і лясоў. Задоўга да 17 верасня 1939 года паэт марыў аб ператварэнні заходнебеларускай балотнай глухамані ў квітнеючую краіну свабоднай працы, узброенай перадавой тэхнікай.

Міхасю Машару належаць паэмы «Смерць Кастуся Каліноўскага» (1934, асобнае выданне), «Мамчына горка» (1936, асобнае выданне) і невялікая паэма «Русалкі», увайшоўшая ў зборнік «На прадвесні» (1936).

У «Смерці Кастуся Каліноўскага» Машара, падобна Танку, перамагае традыцыйную нацыяналістычную трактоўку гэтага вобраза. У паэме паказаны смелыя паводзіны сялянскага рэвалюцыянера Каліноўскага перад царскім судом і ў момант пакарання смерцю. Упэўненасць у канчатковай перамозе народнай справы гучыць у словах Каліноўскага, звернутых да царскіх суддзяў:

Ужо блізак, блізак дзень расплаты
Для вас — народаў грабары.
Штыхамі й петлямі вы, каты,
Той не стрымаеце пары.

Вобраз Кастуся Каліноўскага ў паэме не разгорнут, многае ў ёй аддае рыторыкай.

Паэма «Мамчына горка» напісана на традыцыйную тэму трагічнага кахання прыгоннага селяніна да графскай дачкі. Характары герояў гэтага твора вызначаюцца меладраматызмам, некалькі змякчаемымі народна-паэтычнымі матывамі, шырока выкарыстанымі Машарай.

Асноўным недахопам паэмы Машары з'яўляецца абстрактнасць іх рэвалюцыйнага рамантызму.

Характэрны для паэзіі Машары працоўны пафас, пафас творчасці з асаблівай сілай прагучаў у яго вершах савецкага часу:

Мой край ужо не пад нагой вяльможных,
Над ім прамень крэмлёўскіх зор гарыць!
Учарашні раб —
ў сям'і непераможнай,
Іду я смела новы дзень тварыць.
(«Прывітанне», лістапад 1939).

Міхась Машара быў адным з першых паэтаў, які апеў парасткі новага на вызваленай зямлі:

Фабрыкі ў рытме вясёлым
Ужо беспрацоўе зняслі,
Усім беззямельным па сёлах
Панскай хапіла зямлі.

Выраслі курсы і школы,
Вольны нам далі і шыр.
Радасцю нашай чырвонай
Славім цябе, правадыр.
(«Правадыр», лістапад 1939).

Парасткі соцыялізма — гэта тэма стала цяпер асноўнай тэмай паэта.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У4463 Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва.

Мінск, друкарня «Звязды».